Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый

Кафедра бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
________Ю.М. Галкоўская
___ ____________2018 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
______________М.А.Яцэвіч
___ ____________2018 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# СТВАРЭННЕ ФАКТАГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Складальнік: В.І. Саітава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Разгледжана і рэкамендавана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 20 лютага 2018 г.
пратакол № 6

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*В. І. Саітава,* прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Метадычны савет* ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”

*В. А. Касап,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

*кафедрай* бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

(пратакол ад 26 студзеня 2018 № 5);

*Саветам* факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

(пратакол ад 30 студзеня 2018 № 5)

Вучоным Саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

(пратакол ад 20 лютага 2018 № 6)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 5
2.1 Тэксты лекцый “Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы” 6
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 43
3.1 Тэматыка лабараторных заняткаў 43
3.2 Тэматыка курсавых работ 43
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 44
4.1 Пералік пытанняў па тэмах лабараторных заняткаў 44
4.2 Заданне для самастойнай работы ў межсесійны перыяд 48
4.3 Пытанні і заданні па вучэбнай дысцыпліне “Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы” да заліку 50
4.4 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў 52
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 53
5.1 Вучэбная праграма 53
5.2 Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны 56
5.3 Асноўная літаратура 57
5.4 Дадатковая літаратура 58
5.5 Электронныя адукацыйныя рэсурсы 60

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы” абумоўлена хуткім развіццём фактаграфічнай інфармацыі і актыўным удзелам бібліятэк у яе падрыхтоўцы і давядзенні да карыстальнікаў. Вучэбная дысцыпліна з'яўляецца курсам па выбару для студэнтаў завочнага факультэта па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

*Мэтай* дысцыпліны з'яўляецца вывучэнне сучасных тэхналогій вытворчасці і выкарыстання фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэках.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступнага кола *задач*:

– вывучыць асаблівасці фактаграфічнай інфармацыі;
– уяўляць склад аб’ектаў фактаграфічнай інфармацыі;
– авалодаць метадамі падрыхтоўкі фактаграфічных запісаў і разнастайных фактаграфічных інфармацыйных прадуктаў.

У працэсе вывучэння дысцыпліны ў студэнтаў фарміруюцца *прафесійныя кампетэнцыі*:

- здольнасць да вывучэння і аналізу бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;
- здольнасць да выяўлення, аналізу і ацэнкі інфармацыйных рэсурсаў грамадства;
- гатоўнасць да аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі інфармацыі;
- гатоўнасць да вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей членаў грамадства;
- гатоўнасць да падрыхтоўкі інфармацыйнай прадукцыі на аснове інфармацыйных рэсурсаў.

У складзе ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне змешчаны тэксты лекцый, пералікі тэм лабараторных работ і задання на межсесійны перыяд, іх метадычныя распрацоўкі. Асаблівасцю (лабараторных работ з’яўляецца правядзенне іх ва ўмовах камп’ютарных класаў і магчымасць індывідуалізацыі заданняў. Пытанні і заданні да заліку адлюстроўваюць тэарэтычныя, метадычныя (тэхналагічныя) аспекты стварэння фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі. Паспяхова засвоіць змест, логіку і паслядоўнасць матэрыялу студэнтам дапамогуць вучэбная праграма і спісы асноўнай і дадатковай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## ТЭКСТЫ ЛЕКЦЫЙ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ФІДК І ФЗН

ЗМЕСТ

Лекцыя 1. Тэарэтычныя пытанні стварэння фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў 6
Лекцыя 2. Асаблівасці фактаграфічнага запісу ў розных жанрах інфармацыйнай прадукцыі 13
Лекцыя 3. Методыка стварэння хранікальных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі 20
Лекцыя 4. Методыка стварэння персанаграфічных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі 32

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1. Тэарэтычныя пытанні стварэння фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў

### Пытанні

1. Паняцце “фактаграфічная інфармацыя” і яе аб’екты.
2. Уласцівасці фактаграфічнай інфармацыі.
3. Структура фактаграфічнай інфармацыі.

*Пытанне 1. Паняцце “фактаграфічная інфармацыя” і яе аб’екты.*

Развіццё інфармацыйных працэсаў прывяло да стварэння на аснове першаснай інфармацыі асобага віда – другаснай інфармацыі. Яе сутнасць заключаецца ў адлюстраванні ў свядомасці чалавека першасных інфармацыйных з’яў, у т.л. адлюстраваных у тэкстах, дакументах. Узнікла другасная інфармацыя ў далёкай старажытнасці, калі людзі пачалі ствараць тэксты, кнігі. У сваю чаргу другасная інфармацыя падзялілася на два віды: бібліяграфічную і фактаграфічную. Гэтыя два віды другаснай інфармацыі ўпарадкоўваюць прастору інфармацыі, перадаюць яе ў часе, пераадольваюць разнастайныя інфармацыйныя і камунікацыйныя бар’еры.

Паколькі наогул інфармацыі ўласціва адлюстравальная і пасрэдніцкая сутнасць, г.зн. яе можна трактаваць як метад сувязі чалавека і рэальнага свету, то сярод набытых ёю ў працэсе гістарычнага развіцця соцыуму уласцівасцяў, мэтазгодна назваць намінатыўнасць, мадэльнасць, згортванне і камунікатыўнасць. Намінатыўнасць і мадэльнасць выяўляюцца ў здольнасці чалавека адлюстроўваць аб'екты свету ў выглядзе вобразаў (мадэляў), якім ён дае назвы (словы-намены). Згортванне, як следства намінатыўнага і мадэльнага, выяўляецца ў стварэнні кампактных мадэляў адлюстроўваемых з'яў рэчаіснасці, якія захоўваюць іх сутнасць. Кампактная мадэль захоўвае і здольнасць да разгортвання інфармацыі.

Развіццё разумовага працэсу ад сузірання канкрэтнасці да абстрактных паняццяў, прыводзіць да згортвання інфармацыі і стварэння ўсё больш ёмкіх паняццяў і з'яўлення ўсё больш агульных номенаў (назваў, імёнаў). З развіццём соцыума інфармацыйны працэс пачаў ажыццяўляцца не праз кантакт з рэальнымі з'явамі, а з яго номенамі. Аб'ектыўна развіццё інфармацыйнага працэсу прывяло да ўзнікнення на аснове першаснай інфармацыі адмысловага віду – другаснай інфармацыі. Яе сутнасць заключаецца ў адлюстраванні факта першаснай інфармацыйнай з'явы ў свядомасці чалавека, з прычыны чаго ёй ўласцівая камунікатыўнасць. Такім чынам, другасная інфармацыя – гэта інфармацыя аб інфармацыі. Другасная інфармацыя ўпарадкуе прастору інфармацыі і веды з мэтай арыентацыі ў ёй і ахоплівае сферу фіксаванай (дакументаванай) інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У другаснай фіксаванай інфармацыі, у сваю чаргу, па аб'ектыўных прычынах вызначыліся два віды: фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя. Другасная інфармацыя, мэтай якой з'яўляецца адлюстраванне і ўпарадкаванне дакументаў (тэкстаў) як часткі гісторыка-культурнага працэсу, стала асновай развіцця бібліяграфіі і яе прадукцыі, прызначанай для задавальнення інфармацыйна-дакументальных грамадскіх патрэбаў. Другасная інфармацыя, мэтай якой стала адлюстраванне разнастайнасці фактаў першасных інфармацыйных з'яў, выявілася ў развіцці фактаграфічнай інфармацыі, і яе рэсурсаў. Фактаграфічная інфармацыя, адзначае Т.Ф. Берастава, ад свайго першароднага субстрата нясе асноўныя сэнсы, г.зн. змест, семантыку дакумента. Факт заўсёды выступае ў форме апісання, у якім злучаюцца аб'ектыўны змест і суб'ектыўная форма – па-за сродкаў пісьмовай фіксацыі факту не існуе. Факты з'яўляюцца квантамі інфармацыі аб аб'ектыўным існаванні рэчаў, уласцівасцяў, адносін, падзей і ўяўляюць сабой пэўныя адзінкі веды, якія выказваюць некаторы інварыянт інфармацыі аб аднатыпных падзеях і з'явах. Абодва віды другаснай інфармацыі – бібліяграфічная і фактаграфічная знаходзяцца ва ўзаемадзеянні, напрыклад, першасныя тэксты↔ матэрыялы бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі; уласна фактаграфічныя рэсурсы таксама атрымліваюць бібліяграфічнае аснашчэнне, і адпаведна, бібліяграфічная прадукцыя можа ўтрымліваць пласты фактаграфічнай інфармацыі. У складзе фактаграфічных рэсурсаў з далёкіх гістарычных часоў вылучыліся асаблівыя інфармацыйныя крыніцы – энцыклапедыі. Спецыфіка энцыклапедыі заключаецца ў тым, што першапачаткова і да нашых дзён – гэта крыніцы другаснай фіксаванай інфармацыі, якія адлюстроўваюць факт існавання першаснай інфармацыі, такім чынам, яны камунікатыўныя, і ў іх выяўляецца ідэнтыфікацыйная ўласцівасць: энцыклапедыі збіраюць (адлюстроўваюць) номены, раскрываючы іх з дапамогай мадэлявання першаснай інфармацыі, згортваючы / разгортваючы яе.

*Фактаграфічная інфармацыя* – гэта апісанне фактаў, якія згрупаваны па пэўных сістэмаўтваральных прыметах, што дазваляе дакладна ідэнтыфікаваць факты і зручна іх выкарыстоўваць. Асноўным элементам фактаграфічнай інфармацыі з’яўляецца апісанне факта. *Факт* – гэта падзея, з’ява, прадмет, якасць, веды, сапраўднасць якіх даказана, навукова падцверджана (ці цвёрда ўстаноўленая падстава, на якой будуюцца тэорыя).

На бягучы час паняцце “факт” можа быць выкарыстана разам з паняццем “даныя” як сінонімы ў інфармацыйнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым выказваюцца думкі пра тое, што паняцце “факт” грунтуецца на крытычным аналізе і навуковым абгрунтаванні. А для даных нібыта гэта не абавязковае патрабаванне.

Фактаграфічная інфармацыя (ФІ) актыўна ствараецца, распаўсюджваецца і выкарыстоўваецца ва ўсіх сацыяльных інстытутах СДК. Бібліятэкі, як і іншыя грамадскія інстытуты, дзякуючы якім ажыццяўляюцца камунікатыўныя працэсы ў соцыўме, актыўна працуюць з рэсурсамі фактаграфічнай інфармацыі і самі ствараюць іх.

Фактаграфічная інфармацыя даўно і шырока выкарыстоўваецца ў бібліятэках, фактычна ўсімі карыстальнікамі бібліятэк. Від, тып бібліятэкі, асаблівасці інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў заўсёды ўплывалі і ўплываюць на змест фактаграфічнай інфармацыі, якая кумуліруецца і выкарыстоўваецца ў бібліятэках. З аднаго боку, бібліятэкі набываюць крыніцы фіксаванай фактаграфічнай інфармацыі: даведачныя выданні, фактаграфічныя БД і інш. Генератарамі і пастаўшчыкамі рэсурсаў фактаграфічнай інфармацыі з’яўляюцца камерцыйныя структуры: інфармацыйныя карпарацыі, інфармацыйныя агентствы, інфармацыйныя службы і інфармацыйныя цэнтры, якія прадстаўляюць велізарныя патокі гэтай інфармацыі ў самых разнастайных формах і рэжымах. З другога боку, самі бібліятэкі з’яўляюцца стваральнікамі разнастайных фактаграфічных рэсурсаў. Напрыклад, беларусазнаўчая фактаграфічная база даных “Беларусь у асобах і падзеях”, база даных нацыянальных аўтарытэтных файлаў НББ. Фактаграфічныя БД вядуцца рэспубліканскімі навуковымі і абласнымі навуковымі бібліятэкамі, публічнымі і іншымі бібліятэкамі.

Аб’ектамі фактаграфічнай інфармацыі з’яўляюцца:

- Геаграфічныя назвы і месцапалажэння аб’ектаў
- Персаналіі
- Арганізацыі
- Установы
- Прадпрыемствы
- Статыстычныя даныя
- Падзеі
- Даты, гістарычныя перыяды
- Адрасныя (кантактныя) звесткі
- Паказчыкі, лічбы
- Рэквізіты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Тэрміны
- Абрэвіятуры
- Геральдычныя сімвалы і інш.

Згодна аб’ектаў вылучыюць і вітды фактаграфічных запытаў.

*Геаграфічныя назвы* – да гэтай групы адносіцца вялікае кола аб’ектаў зямной паверхні, воднай прасторы, транспартных магістраляў, эканамічных аб’ектаў, некаторыя назвы ваенных і культурна-гістарычных падзей, назвы. Геаграфічныя назвы змяняюцца пад уплывам шэрагу грамадскіх фактараў: пануючай мовы, афіцыйнай палітыкі наймення аб’ектаў і інш. На міжнародным узроўні ў наш час дзейнічаюць стандартныя патрабаванні да ўнармавання геаграфічных назваў. У Рэспубліцы Беларусь праведзена ўнармаванне назваў населеных пунктаў, дзейнічае Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 лістапада 2010 г. № 190-З “О наименованиях географических объектов”. Зараз геаграфічныя назвы разглядаюцца як гісторыка-культурныя каштоўнасці.

*Персаналіі* – імёны ўраджэнцаў, дзеячаў края, вядомых асоб, якія наведалі край. Імёны з’яўляюцца складамі з’явамі. У сваёй працы бібліятэкары сустракаюцца з поўным супадзеннем імён розных людзей, што патрабуе праводзіць іх ідэнтыфікацыю. Існуе недахоп звестак пра людзей, што пакінулі след у нацыянальнай гісторыі. Бібліятэкар павінен разбірацца ў рознай графіцы напісання імён, што характэрна для некаторых гістарычных перыядаў.

*Арганізацыі, установы, прадпрыемствы і т.п.* Пры вызначэнні фактаграфічных звестак, звязаных з імі вельмі важна выяўляць дакладныя найменні, перайменаванні, змену статуса, склад выпускаемай прадукцыі; спадарожна выяўляюцца таксама і многія іншыя фактаграфічныя звесткі.

*Статыстычныя даныя* – яны, як правіла, ужо афіцыйна падрыхтаваны і бібліятэка забяспечвае доступ да іх. Статыстычныя даныя бібліятэкары часта выкарыстоўваюць падчас падрыхтоўкі разнастайных мерапрыемстваў і бібліятэчных матэрыялаў.

*Падзеі* – могуць быць адлюстраваны ў даведачных выданнях, у БД, але ў краязнаўстве бібліятэкарам нярэдка трэба самім выяўляць і апісваць пэўныя падзеі. Падзеі таксама могуць выяўляцца як па дакументальных крыніцах, так і ад сведкаў (вусныя звесткі), якія вельмі пажадана зафіксаваць. Бібліятэкары краязнаўцы вядуць пошук падзей малавядомых, мала адлюстраваных у дакументах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Даты* – звязаны з падзеямі, асобамі, геаграфічнымі аб’ектамі і інш. Ёсць даты недакладныя, памылковыя, якія па некаторых прычынах трапілі ў дакументальныя крыніцы. Неабходна іх удакладняць і гэта цяжка, калі даты звязаны з падзеямі малавядомымі, а значнымі для рэгіёнаў. Адносна дат перад бібліятэкарамі стаіць задача ўстанаўлення дакладных дат. Працуючы з гістарычнымі датамі бібліятэкар павінен звяртаць увагу на адпаведнасць даты сучаснаму стылю (у Беларусі даты неаднаразова змяняліся: грэгарыянскі стыль, затым юліянскі і зноў грэгарыянскі). Магчыма выкарыстоўваць канвертары дат у Інтэрнеце.

*Адрасныя звесткі* – часта запатрабаваны сучасныя адрасныя звесткі, а таксама адрасы пэўных аб’ектаў гістарычнага характару (дзе размяшчаўся ў пачатку ХХ ст. Настаўніцкі інстытут у Магілёве?), з якімі звяртаюцца гісторыкі, краязнаўцы, турысты і інш.

*Помнікі* – маюць даволі разгорнутую класіфікацыю і ў кантэксце краязнаўчай дзейнасці найбольшая ўвага надаецца гістарычным помнікам (звязаным з падзеямі), помнікам архітэктуры, ландшафтным помнікам і помнікам прыроды, археалагічным помнікам. Пры іх вывучэнні важна ўстанаўленне дакладнай назвы і варыянтаў назвы, даты/часа ўзнікнення/стварэння, імя архітэктара/скульптара/фундатара; апісанне помніка (выгляду), даныя аб рэканструкцыі/кансервацыі; звесткі аб традыцыях ушанавання помніка (парады, ускладанне кветак, фотасесіі падчас шлюба); адрас, месца размяшчэння, звесткі аб пераносе помніка.

Гэта некаторыя аб’екты, на самой справе іх значна больш. Пачынаючы працу з аб’ектамі трэба праглядаць ужо створаныя ФІР, дапаўняць патрэбнымі звесткамі, уносіць удакладненні, якія на бягучы час дала навука.

Уяўляць патрабаванні да фактаграфічная інфармацыя (ФІ) і апісання яе аб’ектаў дапамагае веданне ўласцівасцей ФІ.

*Пытанне 2. Уласцівасці фактаграфічных інфармацыі (рэсурсаў)*

Сярод уласцівасцей ФІ (а таксама ФІР) выдзяляюцца наступныя:

1) другаснасць і першаснасць. ФІ па сваёй прыродзе другасная, але ў яе сістэме ёсць патокі, якія ствараюцца адразу ў выглядзе фактаграфічных даных, а не бяруцца з тэкстаў. Першаснасць праяўляецца ў тым, што 1) функцыянуюць патокі ФІ, якія першасныя па сваёй прыродзе, н-д, бухгалтарскія факты 2) але і створаныя на падставе першасных дакументаў фактаграфічныя паведамленні, н-д, артыкулы энц-і, самі па сабе становяцца ўнікальнай і аўтарытэтнай інфармацыяй і становяцца гісторыка-культурнымі фактамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) дастатковая ідэнтыфікацыя фактаў, а таксама ведаў і нават, часам, тэкстаў.

3) аднатыпнасць і пэўная ўпарадкаванасць элементаў. Існуюць фактаграфічныя рэсурсы, дзе гэтыя патрабаванні даводзяцца да высокага ўзроўню, напрыклад, даныя прадстаўлены ў табліцах. Фактаграфічныя рэсурсы, даныя могуць мець слабаарганізаваную ўпарадкаванасць, асабліва інфармацыйныя прадукты публічных бібліятэк. У шэрагу жанрах ФІП выкарыстоўваюцца элементы папулярызацыі і вольнага структуравання фактаграфічных звестак.

4) выбарачнасць і фрагментарнасць – з дакументальных крыніц адбіраюцца пэўныя факты, іншыя апускаюцца, а фрагментарнасць характарызуе ФІ у межах пэўнага прадукта.

5) дакладнасць і дастатковая паўната звестак.

6) аператыўнасць папаўнення, карэкціроўка і пры неабходнасці замены звестак.

7) адсутнасць факталагічнага аналізу і аўтарскай інтэрпрэтацыі аб’ектаў адлюстравання.

8) камплексіраванне ФІ з бібліяграфічнай.

*Пытанне 3. Структура фактаграфічнай інфармацыі.*

Фактаграфічная інфармацыя – паняцце абстрактнае, тэарэтычнае, яно ўжываецца ў навуковых і прафесійных зносінах. Рэалізуецца праз стварэнне фактаграфічнага запісу і разнастайных фактаграфічных дакументаў, фактаграфічнай прадукцыі і фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў (матэрыялаў). Менавіта яны ствараюцца і ў бібліятэках. Усе гэтыя паняцці могуць выкарыстоўвацца як сінонімы – фактаграфічны дакумент (ФД), фактаграфічны прадукт (ФП), ФІР, фактаграфічныя матэрыялы (ФМ).

Паняцце фактаграфічны запіс (ФЗ) з’яўляецца параўнальна новым, з’явілася, калі пачалі ствараць фактаграфічныя БД. ФЗ – гэта фіксаванае фактаграфічнае паведамленне/апісанне. З гэтых трох тэрмінаў пакуль што больш рспаўсюджаны: фактаграфічнае апісанне. Але ўсе 3 паняцці аб’ядноўвае тое, што яны ўтвораны з набора звестак, які дазваляе даць характарыстыку таго ці іншага факта канкрэтнага аб’екта рэчаіснасці.

У бібліятэчнай практыцы і ў галіне падрыхтоўкі даведачных выданняў выкарыстоўваецца паняцце “фактаграфічная даведка”. У бібліятэчнай практыцы фактаграфічная даведка выкарыстоўваецца як:

1) Адзін з відаў даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання (фактаграфічнае абслугоўванне) і від даведкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Гэта разгорнутае апісанне пэўнага факта, прымяняемае часцей за ўсё пры стварэнні бібліяграфічных дапаможнікаў, такіх як:
- персанальныя
- біябібліяграфічныя
- календары знамянальных і памятных дат і інш.

Уніфікаваная тэкставая характарыстыка адлюстраваных аб'ектаў у такіх дапаможніках атрымала назву фактаграфічная даведка.

Фактаграфічныя даведкі ствараюць тэкст энцыклапедый і іншых даведачных выданняў.

Фактаграфічны запіс у сваёй аснове ўтрымлівае фактаграфічнае апісанне/даведку – гэта – набор звестак, якія дазваляюць даць характарыстыку пэўнага аб'екта.

Фактаграфічны запіс – гэта фіксаванае фактаграфічнае паведамленне. Галоўнымі элементамі фактаграфічнага запісу з'яўляюцца фактаграфічныя звесткі – набор індыкатыўных элементаў, які дазваляе характарызаваць пэўны (адлюстроўваемы) аб'ект рэчаіснасці.

Фактаграфічныя запісы ствараюцца з рознай колькасці даных ці некалькіх звестак і маюць некалькі структурных узроўняў (відаў):

1) аднаўзроўневы ФЗ – прадстаўляе толькі ўніфікаваныя фактаграфічныя апісанні падзей, асоб, устаноў і іншых даных.

2) двухузроўневы ФЗ – фактаграфічныя апісанні дапаўняюцца бібліяграфічнымі апісаннямі. Фактаграфічныя звесткі размяшчаюцца першымі, а БЗ указваюцца як крыніцы звестак.

3) трохузроўневы ці шматузроўневы ФЗ – фактаграфічныя і бібліяграфічныя апісанні дапаўняюцца тэкставымі матэрыяламі (вершы, урыўкі з прозы, тэксты гістарычных першакрыніц і інш., а таксама выяўленчыя матэрыялы і інш.).

Усе віды ФЗ выкарыстоўваюцца і ствараюцца ў бібліятэках.

ФІ існуе ў выглядзе ФІР/ФІП бібліятэк. ФІП/ФІР могуць быць у выглядзе асобных дакументаў – даведнікаў, энцыклапедый, календароў, хронік, пуцевадзіцелей і інш. і як масівы дакументаў, прадстаўленых у бібліятэках, архівах і іншых інфармацыйных сістэмах. ФІР уваходзяць у склад ІР бібліятэк.

У гістарычнай рэтраспектыве праяўляецца ўстойлівая тэндэнцыя росту колькасці фіксаваных крыніц ФІ і пашырэнннe іх жанраў, формаў. Напрыклад, у апошнія стагоддзі высока запатрабаванымі з'яўляюцца даведачныя выданні, а зараз фактаграфічныя БД (значную іх колькасць ствараюць камерцыйныя структуры і бібліятэкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Лекцыя 2. Асаблівасці фактаграфічнага запісу ў розных жанрах інфармацыйнай прадукцыі

1. Метады стварэння фактаграфічных паведамленняў
2. Моўныя стылі стварэння фактаграфічных паведамленняў
3. Жанрава-тыпалагічны склад фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі
4. Асаблівасці ФЗ нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў

### *1. Метады стварэння фактаграфічных паведамленняў*

Асноўным метадам стварэння фактаграфічных пісьмовых паведамленняў, асабліва разгорнутых, з'яўляецца кампілятыўны моўны сінтэз. Гэты метад наогул прызначаны для распаўсюджання сярод шырокіх колаў карыстальнікаў, чытачоў, насельніцтва, пэўных спецыяльных ведаў. Кампілятыўны моўны сінтэз дазваляе з першасных тэкстаў выяўляць патрэбную інфармацыю і прадстаўляць яе ў лаканічнай форме для лепшага яе ўспрыймання і засваення.

Прынцып кампіляцыі дазваляе перадаваць канкрэтную інфармацыю ў лаканічнай форме для лепшага яе ўспрыймання і засываення.

Асноўныя прыёмы кампіляцыі:

1) кампазіцыйнымі змяненні зыходнага тэкста – у пэўным тэксце робяцца пропускі для выключэння нязначнага, пабочнага і ўстаўкі – уключаецца іншы важны матэрыял, узяты з другіх крыніц.

2) Камбінатарнымі змяненнямі – у ходзе стварэння кампілятыўнага тэкста, падбіраюцца і аб'ядноўваюцца ў адзіны тэкст патрэбныя фрагменты (сказы).

У Беларусі бібліятэкі могуць выкарыстоўваць названыя прыёмы пры стварэннні ФІП, але для замежных краін такая методыка часам звязана з неабходнасцю ўрэгулявання пытанняў аўтарскага права.

Такім чынам, наяўнасць новага адрасата і новай мэты, якія фармулююцца бібліятэкарам-бібліёграфам пры стварэнні фактаграфічнай прадукцыі ўплывае на пераўтварэнне аналагічных характарыстык зыходных тэкстаў, прататытаў, што спрыяе ўзнікненню ўласных жанравых прымет ствараемых фактаграфічных прадуктаў.

3) Уніфікацыя параметраў, якія павінны характарызаваць аб'ект. Асабліва ярка праяўляецца пры фарміраванні ўніфікаваных БД, калі ў пэўны фармат уключаюцца аднатыпныя даныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) Даволі істотна можа змяняцца стыль зыходных твораў: лексічны, марфалагічны, сінтактычны.

Неабходныя факты бібліятэкары выяўляюць на падставе тэкстаў, фрагментаў тэкстаў. Факты выяўляюцца па сказах, якія змяшчаюць упамінанні аб’ектаў ці спасылкі на іх. Бібліятэкару неабходна авалодваць спецыяльнымі семантыка-лінгвістычнымі метадамі, якія дазваляюць атрымаць дакладныя і поўныя факты (адпаведна пастаўленым мэтам). У сувязі з гэтым бібліятэкару неабходна:

Распазнаваць неабходныя факты – напрыклад, асоб, арганізацый, органаў кіравання, іх адрасы.

Будаваць (планаваць) элементы макета (шаблона) фактаграфічнага паведамлення. Напрыклад, *Тадэвуш Касцюшка, ці Тадэвуш А́нджей Таде́уш Бонавенту́ра Костю́шко или Косцюшко (польск. Andrzej Tadeusz Bonawentura Kościuszko, белар. Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, літ. Tadas Kosciuška;*

Планаваць сувязі паміж элементамі фактаграфічнага паведамлення. Напрыклад, пры характарыстыкі выдатных людзей рэгіёна, навучальнай/навуковай установы магчыма прадугледзець адлюстраванне роднасных сувязей паміж імі.

Натуральныя мовы, на якіх створаны тэксты навуковых, навукова-папулярных і іншых крыніц, па якіх вядзецца пошук фактаў, як правіла, мінімум кантэкстна свабодны.

Да ліку фармальных тэкставых прымет адносяцца перш за ўсё маркеры і індыкатары, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць фразы дакумента, якія адносяцца да розных яго сэнсавых (змястоўным) аспектаў.

Асноўная задача прымянення тэкставых фармальных прымет зводзіцца да ідэнтыфікацыі фраз, якія адносяцца да пэўных фрагментах тэксту.

Тры асноўных віды інфармацыйнага пошуку: бібліяграфічны, дакументальны і фактаграфічны. Яны цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. Для пошуку дакумента або выдання, трэба спачатку ведаць нейкія факты: аўтар, год выдання, г. зн. правесці бібліяграфічны пошук. Для фактаграфічнага пошуку у якой-небудзь галіне ведаў або практыкі патрабуецца спачатку правесці бібліяграфічны і дакументальны пошук.

### *2. Моўныя стылі стварэння фактаграфічных паведамленняў*

1. Інфармацыйны – максімальна згорнуты стыль, падыходзіць для адлюстравання асобных фактаў, каб даць іх асноўную характарыстыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйны стыль выкарыстоўваецца і для стварэння разгорнутых фактаграфічных паведамленняў, калі неабходна пэўна паказаць падзею, даць характарыстыку аб'екта, асобы. Для інфармацыйных стыляў пажадана прытрымлівацца нейтральнасці.

2. Папулярны стыль выкарыстоўваецца пры стварэнні разгорнутых фактаграфічных паведамленняў. Мэта іх – папулярызацыя ведаў, наменамі якіх з'яўляюцца пэўныя факты. Папулярны стыль спрыяе пэўнай эмацыянальнасці афарбавання факта.

Для фактаграфічных даведак можа быць характэрна ўнутраная структураванасць: падзяленне на главы, раздзелы і інш. Такія дзяленні ў іншых даведках могуць адсутнічаць, але ўнутраная ўніфікацыя: логіка, паслядоўнасць пэўных сэнсавых (семантычных) фрагментаў, вытрымліваецца. Напрыклад, у даведках, прысвечаных асобам, вытрымліваецца часта наступная паслядоўнасць звестак: агалоўныя звесткі (поўнае імя, даты жыцця), біяграфічныя даныя, якія таксама падаюцца ў пэўным парадку і бібліяграфічныя даныя.

Пры стварэнні ФІП пажадана распрацаваць элементы макета фактаграфічнага паведамлення і на працягу ўсяго рэсурса паслядоўна яго рэалізаваць. Таксама неабходна прадугледзець на этапе падрыхтоўкі сувязі паміж паведамленнем і паслядоўнасцю элементаў паведамлення.

### *3. Жанрава-тыпалагічны склад фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі*

ФІП разглядаецца як адзін з галоўных відаў інфармацыі, разам з бібліяграфічнай і поўнатэкставай І. У перспектыве ў краіне будуць створаны нацыянальныя рэсурсы ўсіх названых відаў інфармацыі ў лічбавай форме.

Сістэмы жанрава ўтваральных прымет фактаграфічнай прадукцыі (як і бібліяграфічнай) у сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай навуцы амаль няма, гэта праблематыка не распрацавана. Таму магчыма зыходзіць з некаторых эмпірычна выяўленых параўнальных характарыстык жанраў фактаграфічных рэсурсаў.

У якасці асноўных характарыстык для вылучэння жанраў магчыма браць прыметы:

1. Кароткі (сціслы) – разгорнуты аб'ем адлюстравання аднаго факта; малы – вялікі аб'ём тэкста.
2. Нейтральнасць або эмацыянальная афарбаванасць адлюстравання факта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Наяўнасць ці адсутнасць унутранага складанага структуравання асноўнага зместу (тэксту): падзяленне на главы, раздзелы і інш. Максімальна фармалізуецца структура ў фактаграфічных БД. У фармат табліц БД уносяцца аднатыпныя і ўнікаваныя звесткі.

Бібліятэкі выкарыстоўваюць усе формы ФІП: карткавыя (Ф. картатэкі), друкаваныя, электронныя. Апошнія найбольш перспектыўныя і зручныя для пошуку, таксама і найбольш даступныя. Сярод жанраў і тыпаў ФІП вылучаецца шмат розных марэрыялаў, іх можна аб’яднаць у блізкія па методыцы групы.

1. Жанрава-тыпалагічная група – гэта дапаможнікі (рэсурсы) хранікальных жанраў. Гэта каляндары памятных дат, хронікі, БД хранікальнага і каляндарнага напаўнення, часткова даведнікі і інш. Хранікальныя жанры ў сваёй аснове маюць такія звесткі як даты і звязаныя з імі падзеі. Пры стварэнні рэсурсаў хранікальнага жанру адной з найважнейшых задач складальнікаў з’яўляюцца устанаўленне дакладнай даты, або гістарычнага перыяда ці адносна дакладнай.

2. Персанаграфічныя дапаможнікі. У аснове іх стварэння асоба/асобы, якія вызначыліся у сферах дзейнасці, галінах (выдатныя медыкі), у падзеях, канкрэтнай краіне, мясцовасці ці населеных пункце. Вельмі важна сабраць найбольш дакладныя і сапраўдныя звесткі аб асобах, даты іх жыцця і дзейнасці. Дапаможнікі прадстаўляюцца ў жанрах: біябібліяграфічных слоўнікаў, даведнікаў, БД, літаратурных карт і інш.

3. Універсальныя рэсурсы, якія звычайна прысвечаны пэўнаму рэгіёну, населенаму пункту ці краіне. Яны прадстаўляюць уніфікаваныя звесткі па многіх галінах рэгёна таго ці інш. аб’екта і прадстаўляюць яго сучасныя і гістарычныя вобразы. Рэалізуюцца ў жанрах энцыклапедый, даведнікаў, праектаў, навастных лентаў бібліятэк. Рэсурсы гэтых жанраў лічацца вельмі прывабнымі для прыцягнення патэнцыяльных інвестараў, турыстаў.

4. Рэсурсы тэматычнага/галіновага зместу, яны рыхтуюцца па актуальных напрамках, найчасцей існуюць у выглядзе даведнікаў, пуцевадзілей, БД.

5. Нацыянальныя аўтарытэтныя даныя. Ствараюцца нацыянальнымі бібліятэкамі (сумесна з іншымі бібліятэкамі і цэнтрамі нацыянальнай бібліяграфіі). З’яўляюцца ўніверсальнымі даведнікамі, якія адлюстроўваюць розныя намены (энтытэты): геаграфічныя аб’екты, персаналіі, назвы ўстаноў і арганізацый і інш. Маюць вялікае значэнне для карпаратыўнай каталагізацыі, абмена бібліяграфічнымі запісамі і не менш значныя як аўтарытэтныя даведнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўсіх групах ФІР канкрэтныя ствараемыя прадукты залежаць ад пастаўленых бібліятэкай мэт і яе рэсурсных магчымасцей (кадравых, фінансавых і МТБ). Прыярытэтным фактарам ФІ прадукцыі для бібліятэк усіх тыпаў з'яўляецца падрыхтоўка БД, віртуальных праектаў і інш.

*4. Асаблівасці ФЗ нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў*

Нацыянальныя фактаграфічныя ІР ствараюцца НББ, РНТБ, іншымі рэспубліканскімі навуковымі бібліятэкамі (часам іншымі бібліятэкамі). Абласныя і спецыяльныя бібліятэкі пераважна ствараюць краязнаўчыя ФІР.

У бягучы час буйнейшымі бібліятэкамі краіны створаны наступныя ФІР.

<u>НББ.</u> Мэтанакіраваная дзейнасць НББ па мадэляванні нацыянальнага дакументнага масіву спрыяла стварэнню фактаграфічных БД:

1) Нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў
2) "Беларусь у падзеях і асобах"
3) "Вучоныя Беларусі"
4) "Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і замежных краін".

Усе яны з'яўляюцца ўнікальнымі даведнікамі, якія змяшчаюць апісанні нацыянальных аб'ектаў, ствараемых на падставе самых надзейных крыніц інфармацыі, і пастаянна абнаўляюцца.

<u>Нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў.</u> БД змяшчае аўтарытэтныя / нарматыўныя, даведачныя, спасылачныя машыначытальныя запісы на наступныя віды найменняў (энтитетов): "імя асобы", "найменне арганізацыі", "радавое імя", "адміністрацыйна-тэрытарыяльнае або геаграфічная назва", "гандлёвая марка", " уніфікаваны загаловак"," абагульняючы ўніфікаваны загаловак","месца выдання як кропка доступу"," форма, жанр або фізічныя характарыстыкі дакумента".

Аўтарытэтныя запісы ўтрымліваюць інфармацыю аб прынятых (усталяваных) загалоўках, уключаюць іх варыянтныя формы, сувязі з іншымі аўтарытэтнымі запісамі, розныя заўвагі і іншую дадатковую інфармацыю, якая характарызуе загаловак або аўтарытэтны запіс у цэлым. На замежныя найменні прыводзяцца варыянты ў аўтэнтычнай форме. Аўтарытэтныя запісы з'яўляюцца кропкамі доступу бібліяграфічнага запісу дакументаў, прадстаўленых у электронным каталозе, а таксама могуць выкарыстоўвацца як самастойны даведачны рэсурс пры выкананні фактаграфічных запытаў па беларускай тэматыцы. БД абнаўляецца пастаянна. Уключае запісы на беларускай, рускай і замежных мовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Беларусь у асобах і падзеях" – беларусазнаўчая БД змяшчае фактаграфічную інфармацыю пра знакамітых людзях, якія ўнеслі значны ўклад у навуковую, культурную і духоўную спадчыну Беларусі; пра найбольш важныя падзеі ў эканамічнай, грамадска-палітычнай, культурнай і іншых сферах жыцця краіны; аб мемарыяльных комплексах, помніках гісторыі, культуры, прыроды; прафесійных творчых калектывах; пра аб'екты, якія з'яўляюцца першымі або ўнікальнымі ў сваім родзе (першы буквар, першая школа, першая выява горада на карце і да т. п.).

У БД дзве асноўныя часткі: “Персаналіі” і “Падзеі” (каля 30 тыс. ФЗ). Краязнаўчы масіў складае каля 90% аб ўсяго аб’ёму запісаў.

Інфармацыя пра персаналіі ўключае ўсе дакументальна выяўленыя варыянты імя на беларускай, рускай і замежных мовх, а таксама псеўданімы, кріптанімы, духоўныя імёны; даты жыцця, месца нараджэння, род дзейнасці, прэміі, ганаровыя, воінскія і іншыя званні, галіна дзейнасці персоны.

Звесткі пра падзеі ўключаюць усе дакументальна выяўленыя варыянты назвы (на беларускай, рускай, замежных мовах, у тым ліку, старыя, скарочаныя назвы), асноўныя даты, тэрыторыі, звязаныя з падзеяй, адносіны да пэўнай галіны дзейнасці, выгляд аб'екта.

Тэкставая інфармацыя дапоўнена ілюстрацыйнымі матэрыялам і гіперспасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы. Прадстаўлена бібліяграфічная інфармацыя як крыніца стварэння фактаграфічных запісаў.

Гэты электронны рэсурс дазваляе аператыўна атрымліваць дакладныя звесткі пра Беларусь, не звяртаючыся да шматлікіх друкаваных даведачных і энцыклапедычных выданняў.

У перспектыве гэта БД будзе стварацца разам з абласнымі і рэспубліканскімі галіновымі бібліятэкамі, арганізацыямі, прадпрыемствамі, якія маюць падобныя краязнаўчыя рэсурсы і жадаюць прадставіць інфармацыю аб сваё гісторыі і дзейнасці.

"Вучоныя Беларусі" - БД з'яўляецца карпаратыўным фактаграфічным інфармацыйным рэсурсам, у якім прадстаўлена інфармацыя:

- асобы, якія маюць вучоныя ступені: дактароў / кандыдатаў навук і навуковыя званні;
- навуковыя работнікі і выкладчыкі ВНУ – аўтары навуковых публікацый;
- вышэйшыя навучальныя ўстановы і структурныя падраздзяленні, у якіх працуюць вучоныя;
- навуковыя дынастыі / сем'і.

Запісы складаюцца на дзвюх дзяржаўных мовах – рускай і беларускай (у залежнасці ад наяўнасці публікацый на гэтых мовах).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пра кожнага вучонага можна атрымаць звесткі біяграфічнага характару, аб навуковых інтарэсах, галінах навуковай дзейнасці, месцы працы , узнагародах, ганаровых званнях і інш. Прыведзены формы імя на рускай, беларускай і іншых мовах, псеўданімы, крыптонімы, духоўныя і іншыя імёны, пад якімі вучоны вядомы або ёсць публікацыі. Удакладнены сувязі з запісамі на ўстановы, у якіх працуюць вучоныя, а таксама з запісамі на навуковыя дынастыі / сем'і.

Запісы забяспечаны спасылкамі на Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі, электронны каталог бібліятэкі - удзельніцы праекту, фота вучонага і персанальны сайт / старонка (пры іх наяўнасці).

У фарміраванні БД "Вучоныя Беларусі" на бягучы момант бяруць удзел Нацыянальная бібліятэка Беларусі і бібліятэкі ВНУ.

Усе вышэй названыя БД утрымліваюць шматузроўневыя ФЗ: фактаграфічныя даведкі (артыкулы), бібліяграфічныя матэрыялы, гіперспасылкі (на поўныя тэксты), выяўленчыя матэрыялы.

“Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і замежных краін”. Фактаграфічная БД складаецца з раздзелаў “Бібліятэкі”, “Персаналіі” і “Электронныя інфармацыйныя рэсурсы”. Раздзел “Бібліятэкі” змяшчае даныя аб адрасах, рэжыме работы і іншую інфармацыю і дазваляе выконваць шматаспектны пошук бібліятэк, у т.л. па рэгіёнах. Гэта БД вядзецца ў таблічнай форме, змяшчае строга арганізаваныя даныя.

РНТБ стварыла БД: біябібліяграфічная БД «Белорусские имена в мировой науке и технике» (з 2011 г.). Уключае звесткі пра ураджэнцаў Беларусі, выдатных дзеячах, якія ўнеслі занчны ўклад у развіццё сусветнай навукі і тэхнікі. Ахоплены імёны з 16 ст. да нашага часу. Звыш 100 асоб.

БД «Знаки экологической маркировки» – інфармацыйны графічны ІР, змяшчае інфармацыя аб знаках экалагічнай маркіроўкі: графічным адлюстраванні комплексу звестак экалагічнага характару аб тавары або паслузе, якія азначаюць, што прадукцыя аказвае меншае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, чым аналагічныя тавары, і / або выраблена з ужываннем экалагічна аптымальных тэхналогій.

Пошук у базе даных ажыццяўляецца па зместу – сферы ўжывання знакаў экалагічнай маркіроўкі і ў Галерэі знакаў – па інфармацыі аб знаку: графічным адлюстраванні знака маркіроўкі, назве маркіроўкі, падрабязнаму апісанню, краіне.

БД прызначана для спецыялістаў вытворчай сферы рэспублікі, навуковых работнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў бібліятэчна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных службаў прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама для шырокага кола карыстальнікаў.

ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі – электронна-тэкставы рэсурс “История белорусской науки в лицах”, у якім змешчаны матэрыялы аб 19 выдатных вучоных: інфармацыйна насычаныя артыкулы, створаныя па ўніфікаванай мадэлі, бібліяграфічныя запісы пра публікацыі вучонага ў электронным каталозе бібліятэкі і яго працы на сайце НАН Беларусі.

## Лекцыя 3. Методыка стварэння хранікальных жанраў ФІП

1. Каляндары памятных дат
2. Хронікі
3. Прадстаўленне хранікальнай інфармацыі ў іншых фактаграфічных дапаможніках

*1. Календары знамянальных і памятных дат*

Календары атрымалі самае шырокае распаўсюджванне ў бібліятэках, іх рыхтуюць абласныя бібліятэкі і ЦБС, спецыяльныя бібліятэкі і нацыянальныя бібліятэкі краін. У перадавой практыцы календары ствараюцца пераважна ў лічбавай форме, у нашай краіне яны ствараюцца ў друкаванай і электроннай форме. Часам каляндары маюць сімвалічныя назвы. Асноўная задача календароў давесці фактаграфічныя, бібліяграфічныя звесткі аб значных рэгіянальных падзеях у галіне, ці ў краіне. У стварэнні кантэнта календароў прымаюць удзел не толькі бібліятэкары-краязнаўцы, але і краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў, архіваў, выкладчыкі ВНУ, спецыялісты і кіраўнікі арганізацый і ўстаноў. Календары існуюць у друкаванай (папяровай і электроннай формах), як вэб-рэсурсы. Электронныя календары ствараюцца з удзелам праграмістаў і вэб-дызайнераў. У электронным календары выкарыстоўваюцца мульцімедыйныя магчымасці.

Электронныя календары рыхтуюцца ў двух фарматах: базы даных і html-старонкі, pdf-файла і html. Для прагляду бібілятэкі выкарыстоўваюць сэрвісы Саламео і Issuu. Гэтыя бясплатныя праграмы надаюць кантэнту падабенства кнігі, з магчымасцю прагляду зместу, раздзелаў, паказальнікаў.

Календары выкарыстоўваюцца школьнікамі, студэнтамі, выкладчыкамі, вучонымі. Геаграфія іх распаўсюджвання абшырная: бібліятэкі рэгіёна і краіны, нацыянальныя інфармацыйныя цэнтры і замежныя краіны. Бібліятэкары могуць выкарыстоўваць календар для падрыхтоўкі маавых мерапрыемстваў, кніжных выставак, аглядаў, навуковых даследаваннняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разнавіднасці календароў дазваляюць выдзеліць:

- фактаграфічныя календары з кароткімі даведкамі;
- навуковыя выданні з разгорнутымі фактаграфічнымі даведкамі (артыкуламі) і бібліяграфічнымі спіскамі;
- комплексныя ІР, якія ўтрымліваюць гіперспасылкі на рэсурсы Інтэрнет.

Пры падрыхтоўцы гэтых дапаможнікаў асноўнымі праблемамі з'яўляюцца:

1) крыніцы выяўлення дат;
2) крытэрыі адбора знамянальных і памятных дат;
3) аб’ём і каштоўнасць рэкамендуемай літаратуры.
4) своечасовасць і рэгулярнасць выпуску календароў.

Падрыхтоўка дапаможнікаў пачынаецца з вызначэння дат, юбілеі якіх наступаюць у будучым годзе. Фармальна гэта даты кратныя 5, але абавязкова ўлічваецца іх грамадская значнасць. Бібліёграфы вядуць пошук такіх дат, абапіраючыся на асноўныя тыповыя катэгорыі: “падзея”, “персона”, “факт”, “месца”, “аб’ект”. Асноўнымі крыніцамі выяўлення такіх дат з'яўляюцца:

- картатэкі/БД мясцовых знамянальных і памятных дат, картатэкі/БД хронікі;
- даведачныя выданні, (рэгіянальныя і нацыянальныя энцыклапедыі, даведнікі і інш.;
- афіцыйныя дакументы (рэгіянальных і цэнтральных органаў улады і кіравання);
- гістарычная літаратура аб краіне і рэгіёне;
- экспазіцыі мясцовых музеяў;
- архіўныя дакументы;
- інфармацыя ад краязнаўцаў.

1. Картатэкі/БД мясцовых дат маюць розныя назвы: напрыклад, Хроніка ці Летапіс населенага пункта ці рэгёна і інш. Яны з’яўляюцца асновай стварэння ўсіх жанраў хранікальнага характару. Гэтыя картатэкі/БД змяшчаюць даты, кароткія фактаграфічныя апісанні падзей, звесткі аб крыніцах інфармацыі. У БД акрамя кароткіх апісальных звестак могуць быць спасылкі на тэксты.

2. Даведачныя выданні, напрыклад, нацыянальныя і рэгіянальныя энцыклапедыі, даведнікі і інш. Асаблівай увагі патрабуюць новыя даведачныя выданні, якія могуць змяшчаць новыя, невядомыя даты. Яны карысныя і тым, што ў іх можа быць адлюстравана новая інтэрпрэтацыя падзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Афіцыйныя дакументы: законы, пастановы, распараджэнні цэнтральных і рэгіянальных органаў улады і кіравання. Гэтыя дакументы вельмі каштоўныя тым, што змяшчаюць дакладныя, правільныя звесткі, тады як іншыя выданні (н-д, папулярныя) могуць утрымліваць памылковыя звесткі.
4. Гістарычная літаратура аб краіне, рэгіёне, населеным пункце. Гістарычную літаратуру варта праглядаць таму што яна змяшчае не толькі самі даты, але і іх характарыстыку падзей, устаноў, аналіз, ацэньвае ролю і тым самым дапамагае бібліятэкару стварыць тэкст фактаграфічнай даведкі, прывесці цікавыя звесткі.
5. Экспазіцыі мясцовых музеяў (ведамасных, нацыянальных, рэгіянальных) – у музеях захоўваюцца асабістыя дакументы, дакументы арганізацый, устаноў, якія дапамагаюць выявіць, ці ўдакладніць дату і падзеі, звязаныя з ёй.
6. Архіўныя дакументы, якія прадстаўлены ў ведамасных, занальных, нацыянальных і іншых архівах. Пошук у архівах праводзяць у тых выпадках, калі даты адсутнічаюць і не хапае матэрыялу для напісання фактаграфічнай даведкі.
7. Інфармацыя ад краязнаўцаў, якія выдатна ведаюць невялікія тэрыторыі.

Па меры выяўлення дат на будучы год, вядзецца картатэка. У картатэцы зручна выдзеліць пяць буйных раздзелаў: «…0 і …5», «…1 і …6», «…2 і …7», «…3 і …8», «…4 і …9». За першым размесцяцца БЗ на падзеі гадоў, якія заканчваюцца на 0 і 5, у другім, якія заканчваюцца на 1 і 6 і г.д. Так лягчэй выяўляць юбілейныя даты для каляндароў і іншых жанраў. Размеркаванне картак унутры дзяленняў – прамая храналогія. Фактаграфічныя запісы на падзеі, якія адбываліся на працягу месяца/месяца, ці аб якіх вядомы толькі месяц ці год, размяркоўваюцца ў канцы месяцаў ці года.

Калі падзея адбывалася на працягу месяца/года, то тады запіс пра гэту падзею ставіцца ў канцы месяца або года.

Электронная тэхналогія прапануе свае магчымасці для ўнясення звестак шляхам выкарыстання Microsoft Office Word. Напрыклад, у праграме Microsoft Office Word магчыма зрабіць папку з пяццю файламі «…0 і …5», «…1 і …6», «…2 і …7», «…3 і …8», «…4 і …9» і весці іх як табліцы. У адзін сталбец заносіць даты, у другі – апісанне падзей і ў трэці – аб крыніцах інфармацыі. Распалажэнне запісаў у межах аднаго файла – храналагічнае. Выкарыстоўваючы сістэму маркераў і пошукавыя магчымасці праграмы магчыма падбіраць даты па году, тэме, геаграфічнай назве, імені асобы і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ствараюцца таксама праграмы спецыяльна прызначаныя для календароў.

Пасля выяўлення дат пачынаецца працэс іх **удакладнення і вывучэння**. Для ўдакладнення дат выкарыстоўваецца шырокае кола крыніц, напрыклад, пастанаўленні і рашэнні мясцовых, а часам і цэнтральных органаў улады аб іх святкаванні. Бібліёграфы выкарыстоўваць апублікаваныя дакументы і матэрыялы архіваў і музеяў.

Спачатку складаецца папярэдні спіс дат, правяраецца іх разнастайнасць і пэўная раўнамернасць прадстаўлення па месяцах. Калі дат у месяцы мала, тады працягваюць прагляд крыніц выяўлення дат. Агульны спіс дат можа быць вялікім, у гэтым выпадку рэкамендуецца абазначаць даты ўмоўнымі маркерамі, каб абазначыць іх тэматыку.

Напрыклад, Рэлігія. Персаналія (даты нараджэння святароў – прадстаўнікоў розных канфесій) – Рэліг. (персон.)

Сувязь (даты ўзнікнення паштовай, тэлефоннай, тэлеграфнай сувязі, даты заснавання існуючых зараз прадпрыемстваў сувязі) – свз.

Работу па ўдакладненні дат адабраных для каляндара трэба весці, папярэдне згрупаваўшы іх па тэмах (з дапамогай маркераў ці пошукавай функцыі праграмы Microsoft Office Word). Падстава – па адной тэме, як правіла, існуюць агульныя крыніцы.

Аднолькавыя па тэматыцы запісы з пераліка дат капіруюцца ў аднолькавыя тэматычныя файлы і збіраюцца ў электроннай папцы “Работа над датамі” (унутры папкі з усімі матэрыяламі чарговага выпуска Каляндара).

Падчас удакладнення дат мінулага важна звярнуць увагу на адпаведнасць сучаснаму каляндару. Трэба вырашыць пытанні з дакладнасцю дат, месцам падзей, удзельнікамі, калі існуюць спрэчныя погляды. Неабходна карыстацца канвертарамі дат, якія зараз ёсць у свабодным доступе. Да ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі выкарыстоўваўся грэгарыянскі стыль, а пасля інкарпарацыі – юліянскі. Таму бібліёграф павінен ведаць пра неабходнасць удакладнення дат па асобных беларускіх тэрыторыях, якія сустракаюцца ў крыніцах за перыяд з 1772, 1793, 1795 да 14 лютага 1918 г. паводле грэгарыянскага стыля. Існуюць правілы пераводу дат са старога на новы стыль. У час Расійскай імперыі на землях Беларусі ствараліся крыніцы на арабскай мове (беларускімі татарамі), яўрэямі, дзе падзеі датаваліся згодна ісламскага і яўрэйскага календароў.

Пісьмовыя крыніцы ВКЛ да XVI ст. уключна змяшчаюць даты па трох варыянтах уліку новага часу (новага года): 1 студзеня – адзначалі новы год

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталікі і пратэстанты, 1 верасня – праваслаўныя, 1 сакавіка – язычніцкая традыцыя. (Сакавіцкая традыцыя нарадзіла абрад“гуканне вясны”).

Разам з тым ўсе канфесіі ў другой палове XVI ст. пачалі карыстацца і юліанскім календаром. Але на змену яму хутка прыйшоў грэгарыянскі. Стэфан Баторы (*быў у 1576-1586 гг. каралем польскім і вялікім князем літоўскім)* увёў яго на ўсю тэрыторыю дзяржавы. Не адбылося без хваляванняў: праваслаўныя купцы і рамеснікі хваляваліся, што іх святочныя дні пачалі прыпадаць на звычайныя дні згодна грэгарыянскаму каляндару. Але паяўленне ўніяцкай царквы спрыяла вырашэнню гэтай праблемы і грэгарыянскі стыль з Новым годам з 1.01 стаў афіцыйным на беларускіх землях з 17 ст. (на 100 год раней, чым у Расіі, дзе юліанскі стыль увёў Петр 1).

Пры неабходнасці даты мэтазгодна звяртацца да канвертара дат.

Тым не менш у крыніцах даты могуць падавацца па-рознаму. Падобныя даты аб адной падзеі/асобе трапяць у розныя месцы картатэкі. Таму трэба звязваць іх паміж сабой спасылкамі “Гл. таксама”. Калі навуковыя погляды на даты змяняюцца, вучоныя прыходзяць да адназначнага прыняцця адной/магчыма зусім новай даты, то варыянты ўдаляюцца.

Асобна трэба адзначыць, што пры вядзенні “Хронікі края” у любой форме неабходна папаўняць “Спіс крыніц выяўлення дат па гісторыі населенага пункта/адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі”. У гэтым спісе павінны быць не толькі выданні (кнігі, перыядычныя выданні), але і неапублікаваныя дакументы з архіваў і інш.

**Адбор дат.** На адбор дат уплываюць такія фактары, як іх грамадская значнасць, актуальнасць, адпаведнасць сучасным грамадскім каштоўнасцям. Календары з’яўляюцца ўніверсальнымі дапаможнікамі. Усе падзеі адлюстраваць немагчыма, але трэба імкнуцца адлюстраваць іх храналагічную, тэматычную і геаграфічную разнастайнасць. Храналагічная разнастайнасць календароў патрабуе адлюстроўваць даты розных перыядаў. Тэматычная – адлюстравання розных бакоў жыцця насельніцтва тэрыторыі. Складаюць пералік тэм, якія па меркаванні складальнікаў, павінны знайсці адлюстраванне ў каляндары.

Часам пры падрыхтоўцы календароў ствараюць калектыў складальнікаў з навуковых рэдактараў, якія адказваюць за канчатковы адбор дат. На адбор дат уплывае і іх колькасць, раўнамернасць ці нераўнамернасць прадстаўлення па месяцах. Калі, напрыклад, дат у месяцы мала, тады працягваюць іх выяўленне; калі іх вельмі многа, то для друкаванага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

календара выкарыстоўваюць прыём выключэння некаторых дат. У віртуальных – не выключаюць.

Адбор дат вядзецца паралельна з падрыхтоўкай фактаграфічных даведак на іх. Адбор дакладнай і каштоўнай літаратуры, якая дапамагае ўдасканальваць даведкі, а таксама гэта літаратура выкарыстоўваецца для стварэння бібліяграфічных спісаў да дат. Пры адборы дат і літаратуры трэба сачыць за выяўленнем цікавых ілюстрацый, якія важныя для любых формаў календара.

1. Фактаграфічная даведка павінна пісацца на падставе самай надзейнай, новай літаратуры, крыніц інфармацыі для ўключэння важных не дастаючых звестак.

Пры планаванні формы падачы даты трэба ўлічваць, наколькі яна забяспечана літаратурай, наколькі шматтыражны існуючыя выданні. Зрабіць гэта дапамагаюць краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы (каталог, картатэка, універсальныя паказальнікі).

Да дат календароў даюцца разгорнутыя і кароткія даведкі і ў некаторых выпадках – артыкулы.

*Разгорнутая фактаграфічная даведка:*

1. Калі крыніцы малатыражныя, старыя, ці адсутнічаюць у бібліятэках рэгіёна;
2. Тэма (гістарычная) малазнаёмая сучаснікам.
3. Неабходна адлюстраваць новыя погляды на падзею.

Калі прыкладна 5 год назад да даты змяшчалася разгорнутая фактаграфічная даведка, то пры яе асвятленні ў новым выпуску календара не трэба паўтараць папярэдні матэрыял, а шукаць новыя звесткі аб падзеі. Напрыклад, рэгулярна адлюстроўваюцца юбілеі Вялікай Айчыннай вайны, то ў чарговых выпусках трэба шукаць новыя аспекты тэмы.

*Кароткія (невялікія) фактаграфічныя даведкі ствараюцца на:*

Даты заснавання прадпрыемстваў, арганізацый, навучальных устаноў, даты нараджэння вядомых асоб трэба суправаджаць невялікімі даведкамі.

Артыкулы ствараюцца пры ўмове недастатковай забяспечанасці пэўнай тэмы дакументальнымі крыніцамі. Артыкулы ствараюцца на наступныя тэмы: гісторыя невялікіх населеных пунктаў. Як правіла, для стварэння даведак неабходна выкарыстоўваць не толькі бібілятэчныя фонды, але і архіўныя фонды, матэрыялы музеяў.

У некаторых выпадках у календары ўключаюцца не арыгінальныя артыкулы, а каштоўныя артыкулы з іншых маладаступных, малатыражных выданняў (са спасылкай на крыніцу). Неабходна прытрымлівацца наступнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правіла: суадносіць аб’ём даведкі з датай. Напрыклад, дата аб невялікім пасяленні, якому 50 год не павінна быць большай, чым даведка аб вёсцы, якой 200 гадоў.

Нельга ўказваць толькі даты заснавання. У даведках трэба адлюстроўваць звесткі аб дасягненнях прадпрыемстваў і арганізацый, жыцці і дзейнасці асоб.

У дачыненні да дат, прысвечаных населеным пунктам і адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам, не падыходзіць нават форма пашыранай даведкі, так як у ёй немагчыма адлюстраваць шматгадовую гісторыю цэлага раёна ці населенага пункта.

Асаблівасці найбольш распаўсюджаных даведак:

*І. Даведкі, прысвечаныя прадпрыемствам, установам, арганізацыям.*

Трэба указваць саму дату, называць падзею, пры неабходнасці даць кароткія тлумачэнні. З даведкі павінна быць зразумела, што адбылося менавіта ў той дзень, які вызначаны як юбілейны. Датай заснавання прадпрыемства можа быць прызнаны дзень прыняцця афіцыйнага дакумента аб яго стварэнні, пачатак ці завяршэнне будаўніцтва, пачатак работы, дзень правядзення мітынга з нагоды адкрыцця ці выпуска першай прадукцыі.

У даведцы аб прадпрыемстве, арганізацыі, навучальнай установе абавязкова павінны быць адзначаны яго першапачатковы статус і назва, а таксама сучасныя; у некаторых выпадках указваюцца і прамежкавыя назвы.

У тэкстах аб прадпрыемствах і арганізацыях павінны быць указаны іх асноўныя задачы і кірункі дзейнасці.

Акрамя таго пажадана даць звесткі аб канкрэтных выніках дзейнасці. Напрыклад, калі разглядаюцца прадпрыемствы будаўнічай галіны, трэба указаць найбольш вядомыя праекты і будынкі. Калі характарызуюцца адукацыйныя ўстановы, паказваюцца дасягненні і лепшыя вучні.

Калі аб прадпрыемстве/установе, якая існавала ў мінулым, вядома мала звестак, напрыклад толькі факт стварэння ў такім-та годзе, то гэтыя звесткі можна ўключыць у даведку, прысвечаную, напрыклад, развіццю галіны ў рэгіёне, да якой адносіцца ўстанова. І наадварот, дата заснавання сучаснай установы можа быць прычынай для кароткага ўпамінання іншых устаноў галіны.

АРМ краязнаўца прызначаны для фарміравання запісаў календара. Яго інтэрфейс дазваляе для кожнага запісу занасіць кароткі змест памятнай падзеі, адпаведныя бібліяграфічныя запісы, а ў асобныя палі заносяцца: значэнні персаналій, назвы арганізацый, геаграфічныя назвы, ключавыя словы і спасылкі на WEB-рэсурсы ў Інтэрнэце. Фарміраванне палёў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персаналій, арганізацый і геаграфічных назваў арганізавана са слоўнікаў-даведнікаў. Фарміраванне ключавых слоў аддадзена цалкам на меркаванні краязнаўцаў. WEB - спасылка робіцца толькі ў тым выпадку, калі ў Інтэрнэце маецца інфармацыя, якая можа больш поўна ахарактарызаваць памятную падзею, адлюстраваную ў запісе. Істотным патрабаваннем да гэтага WEB рэсурсу з'яўляецца яго стабільнасць, т. е. спасылка робіцца толькі на той рэсурс, у працяглым існаванні якога няма ніякіх сумневаў. (Напрыклад, у Пензенскай АБ спасылкі робяцца пакуль толькі на артыкулы з Пензенскай энцыклапедыі, WEB версія якой ўстаноўлена таксама ў бібліятэцы). АРМ дазваляе ажыццяўляць выбар запісаў па розных рэквізітах. Задаючы значэнне какаго-небудзь года можна адабраць запісы, адпаведныя юбілейным падзеям у гэтым годзе, а затым вывесці гадавы тэкставы каляндар. Акрамя таго прадугледжана выгрузка ўсёй базы ў XML-файл, які ў далейшым будзе служыць базай даных для праграмы WEB-доступу да календара. Праграма WEB доступу напісаная на PHP і ўсталяваная на серверы Apache. Яна дазваляе знайсці юбілейныя падзеі для любой даты. Доступ да гэтага рэсурсу ажыццяецца з нашага сайта http://liblermont.ru.

Такім чынам, распрацаваны каляндар памятных дат дазваляе выпускаць штогадовыя тэкставыя календары. Для любой даты забяспечвае пошук юбілейных памятных падзей праз сайт бібліятэкі, а таксама можна аператыўна прадастаўляць дадатковую інфармацыю, размешчаную ў глабальнай сетцы.

*II Персанальныя даведкі*

У гэтых даведках прыводзяцца наступныя звесткі:

Дата нараджэння асобы; пры неабходнасці трэба адзначыць указанне розных дат у крыніцах. Па-магчымасці, трэба звяртацца да самога юбіляра ці яго родных, каб высветліць правільную дату і зразумець прычыну ўзнікнення розных дат.

Даведкі персанальнага характару складаюцца да дат нараджэння, у сувязі з прысваеннямі земляку ганаровага звання, гастролі вядомага артыста ў населеных пунктах, візіт у рэгіён айчыннага ці замежнага дзеяча і інш.

Поўнае імя персоны павінна суправаджацца звесткамі аб годзе і месцы нараджэння: ці аб гадах жыцця, месцах нараджэння і канчыны.

Калі ў матэрыялах аб персоне месца нараджэння і канчыны названы па-старому, у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам мінулага, неабходна ўдакладняць сучасныя назвы, статус і адміністрацыйную прыналежнасць населеных пунктаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У даведцы неабходна называць прафесію і сферы дзейнасці персоны. Неабходна ўказваць, кім, на якім прадпрыемстве, у якія гады працаваў/служыў чалавек.

У тэкстах аб прадстаўніках розных прафесій павінны быць спецыфічныя, характэрныя для гэтых прафесій даныя, напрыклад, звесткі аб голасе ў спевака, у пісьменнікаў – называць галоўныя творы, звяртаць увагу на падзеі, якія адбываліся на данай тэрыторыі. Аб вучоным – у якіх навуковых абласцях ён спецыялізуецца.

Таксама неабходна паказваць, якую ролю адыграла асоба ў сваёй галіне. Для гэтага неабходна паказаць вынікі дзейнасці, напрыклад, перамогі на спартыўных спаборніцтвах. Складальнікі шукаюць факты, якія дапамогуць адлюстраваць дасягненні асобы. Скажам, пры напісанні даведкі аб кіраўніку прадпрыемства можна пералічаць асноўныя дасягненні прадпрыемства ў перыяд кіраўніцтва гэтага чалавека.

Пры складанні даведак аб ветэранах Вялікай Айчыннай вайны, якія сталі вядомымі з-за сваёй даваеннай ці пасляваеннай дзейнасці, трэба ўказаць пра яго ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і ваенных узнагародах.

У некаторых выпадках складальнік у персанальнай даведцы дае кароткія звесткі аб гістарычнай сітуацыі, у якой дзейнічаў чалавек.

Заўсёды прыводзяцца звесткі аб мемарыялізацыі асобы: названых у яго імем вуліцах, іншых аб'ектах, устаноўленых бюстах, мемарыяльных знаках.

У тэматычных і персанальных даведках пажадана ўпамінаць аб фактах, якія адбыліся ўпершыню: у горадзе, раёне, вобласці, краіне ці свеце.

Важна напісаць пра замежных сувязях прадпрыемства/установы, каб паказаць міжнароднае прызнанне іх дзейнасці.

З улікам мэтазгоднасці ў даведках прымяняецца цытаванне. Тэкст у пашыраных даведках не павінен быць сухім, чыста даведачным. Пажадана, каб тэкст, нягледзячы на невялікі аб'ём, быў папулярным і выклікаў у чытача жаданне даведацца больш, чым напісана ў календары.

Аб'ём персанальнай даведкі павялічваецца, калі ідзе гаворка пра ўнікальных асоб з разнабаковымі інтарэсамі. Аб'ёмнымі, як правіла, з'яўляюцца даведкі аб дзеячах мастацтва.

**Групоўка матэрыялу. Даты (рубрыкі) групуюцца ў прамой паслядоўнасці**. Для загалоўкаў выкарыстоўваецца дата і найменне падзеі ці факта. Пажадана ўказваць поўную дату, часам да некаторых падзей вядомы нават гадзіны. Пасля загалоўка змяшчаецца фактаграфічная даведка, або выкарыстоўваецца тэкст – фрагмент з дакументаў. Калі даведка ствараецца бібліёграфам, важна ўключыць цытаты з твораў асоб, якія аставілі прыметны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

след у гісторыі края, вытрымкі з афіцыйных дакументаў, справаздач, мемуараў, літаратурна-мастацкіх твораў гістарычнай тэматыкі, якія “ажыўляюць” дату, ствараюць вобраз падзеі, што аказвае эмацыянальны ўплыў на чытача. Магчыма падабраць фрагмент тэкста ці з некалькіх тэкстаў, звязаўшы іх паміж сабою. Гэта могуць быць вытрымкі з рэдкіх крыніц, напрыклад, кніг XIX ст., даступныя шырокаму колу чытачоў. Асобае значэнне мае цытаванне ўспамінаў, якія перадаюць непаўторнае ўспрыйманне падзеі. У канцы даведкі прыводзіцца спіс літаратуры. Пры недахопе крыніц па вузкіх пытаннях, можна змяшчаць спісы літаратуры ў канцы асобных гістарычных адрэзкаў.

Матэрыялы асноўнай часткі ў бібліяграфічнай хронікі групуюцца ў храналагічнай паслядоўнасці падзей.

**Спісы літаратуры.** Толькі частка выкарыстаных крыніц інфармацыі ўключаецца ў календары ў выглядзе спісаў літаратуры, пажадана, каб гэта была новая літаратура, даступная для шырокага кола карыстальнікаў. Колькасць рэкамендаваных крыніц не павінна быць вялікай, трэба адабраць некалькі важнейшых крыніц. Асабліва актуальна гэта патрабаванне для друкаваных календароў. Некаторыя даты вузкія, канкрэтныя і ў спісы літаратуры магчыма ўключыць толькі газетныя публікацыі і архіўныя матэрыялы.

Зараз усё больш ствараецца календароў, якія не маюць спісаў літаратуры, а змяшчаюць толькі фактаграфічныя звесткі.

**У структуру календара ўваходзяць** прадмова, спіс дат, асноўная частку, дапаможныя паказальнікі. У прадмове даеццца яго характарыстыка і рэкамендацыі па выкарыстанню. Затым можа быць спіс дат года са спасылкам на старонкі, дзе яны характарызуюцца больш падрабязна. Калі дата не зусім дакладная, напрыклад, невядомы дзень ці месяц, то такія даты ў спісе і ў асноўнай частцы паказваюцца ў канцы. Асноўная частка змяшчае тэкставыя даведкі па датах, а таксама фактаграфічныя, статыстычныя, бібліяграфічныя і іншыя матэрыялы. Тэкставыя характарыстыкі дат размяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці дат: дата, месяц, год. Пасля даты даецца канкрэтная і інфарматыўная яе назва. Важным працэсам з'яўляецца падрыхтоўка тэкставай даведкі. Яна павінна адпавядаць патрабаванням навуковасці, даставернасці, дакладнасці, таму пішуць яе на аснове выяўлення і вывучэння першакрыніц, новай навуковай літаратуры, крытычных матэрыялаў, уключаюць даныя з энцыклапедый, замежнамоўных крыніц і інш. Для напісання тэкставых даведак могуць быць запрошаны краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў, журналісты, выкладчыкі ці іншыя асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прычым неабходна прытрымлівацца правіла, чым менш маецца апублікаваных матэрыялаў, тым больш увагі трэба надаваць тэкставай даведцы, паўнаце яе зместу.

Пасля кожнай тэкставай даведкі даецца спіс літаратуры – 5 – 10 назваў найбольш значных і новых публікацый, а таксама архіўных дакументаў, матэрыялаў з музейных калекцый, АВ-дакументаў, ілюстрацый, статыстычных даных.

Могуць складацца імянны (персаналій) і геаграфічны дапаможныя паказальнікі.

Пры аўтаматызаванай тэхналогіі календар ствараецца на аснове фактаграфічнай БД памятных дат. Пры наяўнасці неабходнай інфармацыі ў рэжыме ўводу даных запаўняюцца палі “год”, “месяц”, “дзень” падзеі, даецца яе апісанне. Тэкставыя даведкі і бібліяграфічныя спіскі таксама рыхтуюцца аўтаматызавана на аснове электроннага каталога і БД памятных дат, пасля чаго рэдагуюцца. Аўтаматызаваны рэжым дазваляе ствараць календары, прысвечаныя мясцовасці, тэме і канкрэтнай асобе. Пачалося стварэнне “Календароў знамянальных і памятных дат” як паўнатэкставых БД, якія выстаўляюцца ў інтэрнет.

**Своечасовасць выхаду –** календары, як правіла, рыхтуюцца на год і друкаваныя павінны выходзіць своечасова. Сучасныя тэхналогіі садзейнічаюць такой падрыхтоўцы.

**Зручнае размяшчэнне, рэклам**а календароў. Календары, якія маюць онлайнавы характар, амаль заўсёды знаходзяцца на галоўных старонках або ў раздзелах краязнаўства. На жаль, часам каляндары ў pdf. даволі складана адшукаць на сайтах.

Выпускаюць каляндары ўсе абласныя бібліятэкі, большасць ЦБС, многія спецыяльныя бібілятэкі. Н-д, «Гомель. Историко-краеведческий календарь на текущий год» (содержит информацию о знаменательных датах текущего года).

2. **Бібліяграфічная хроніка.**

**Хроніка –** гэта жанр краязнаўчых фактаграфічных прадуктаў**.** Хронікі вызначаюцца варыятыўнасцю мэтавага і карыстальніцкага прызначэння, а таксама зместу. Віды хронік: агульная, калі адлюстроўваюцца падзеі за ўвесь гістарычны перыяд існавання края (населенага пункта), за пэўны гістарычны перыяд, хроніка ўстановы, пэўнага калектыва (напрыклад, мастацкага), персанальная хроніка, хроніка падзеі. Найбольш грунтоўным рэсурсам з’яўляецца хроніка края, населенага пункта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У большасці невялікіх бібліятэк на сённяшні час вядуцца ў выглядзе картатэк, але перспектыўная тэндэнцыя – стварэнне баз даных і электронных тэкставых рэсурсаў.

*Методыка хронік.* Агульныя хронікі, як правіла, ахопліваюць вялікія гістарычныя перыяды: ад першых звестак па гісторыі рэгіёна – да канца 19 ст., або да сучаснага перыяду. Галоўным элементам фактаграфічнага запісу (ФЗ) з'яўляецца сама дата, якая можа быць дакладнай ці адносна дакладнай.

Рубрыкі (даты) ў хроніцы групуюцца ў прамой паслядоўнасці. Для загалоўкаў выкарыстоўваецца дата і найменне падзеі ці факта. Пажадана ўказваць поўную дату, часам да некаторых падзей вядомы нават гадзіны.

Прыкладна вядомая дата ўлічваецца, калі мела вельмі важнае значэнне. Выбіраюцца падзеі і факты, важныя для вывучэння данага рэгіёна ці населенага пункта (юбілейнасць дат не мае значэння у адрозненне ад жанра каляндара). Аб'ектам адлюстравання могуць быць факты і падзеі любога паходжання, у тым ліку тыя, якія не святкуюцца, але памяць аб іх важная для мясцовай гісторыі (даты вялікіх пажараў і інш.)

Пасля даты ў гэтых рэсурсах коротка фармулюецца падзея, яе змест.

У падзею магчыма ўключаць: геаграфічныя назвы, імёны, назвы ўстаноў і інш. Але ўсе гэтыя звесткі павінны быць значнымі.

Вельмі значнымі з'яўляюцца крыніцы звестак, так як яны павінны быць новымі. У тых выпадках, калі праводзяцца матэрыялы з перыядычнага друку, то ён павінен змяшчаць новыя, невядомыя факты. Крыніцы звестак указваюцца не заўсёды. Абавязак бібліёграфаў – пастаянна сачыць за новымі публікацыямі, у якіх могуць з'явіцца ўдакладненні уключаных у хронікі дат.

Рубрыкі (даты) ў хроніцы групуюцца ў прамой паслядоўнасці. Для загалоўкаў выкарыстоўваецца дата і найменне падзеі ці факта. Пажадана ўказваць поўную дату, часам да некаторых падзей вядомы нават гадзіны. Пасля загалоўка змяшчаецца фактаграфічная даведка, або выкарыстоўваецца тэкст – фрагмент з дакументаў. Калі даведка ствараецца бібліёграфам, важна ўключыць цытаты з твораў асоб, якія аставілі прыметны след у гісторыі края, вытрымкі з афіцыйных дакументаў, справаздач, мемуараў, літаратурна-мастацкіх твораў гістарычнай тэматыкі, якія "ажыўляюць" дату, ствараюць вобраз падзеі, што аказвае эмацыянальны ўплыў на чытача. Магчыма падабраць фрагмент тэкста ці з некалькіх тэкстаў, звязаўшы іх паміж сабою. Гэта могуць быць вытрымкі з рэдкіх крыніц, напрыклад, кніг XIX ст., даступныя шырокаму колу чытачоў. Асобае значэнне мае цытаванне ўспамінаў, якія перадаюць непаўторнае ўспрыйманне падзеі. У канцы даведкі прыводзіцца спіс літаратуры. Пры недахопе крыніц па вузкіх пытаннях, можна змяшчаць спісы літаратуры ў канцы асобных гістарычных адрэзкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матэрыялы асноўнай часткі ў бібліяграфічнай хроніцы групуюцца ў храналагічнай паслядоўнасці падзей.

Картатэкі складаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці, а БД – змяшчаюць добра распрацаваныя паказальнікі: храналагічныя, персанальныя, геаграфічныя. Перавага БД не толькі ў больш шырокіх пошукавых магчымасцях, але і ў далучэнні іншых рэсурсаў праз гіперспасылкі.

1. Хронікі жыцця і дзейнасці ствараюцца спадарожна пры падрыхтоўцы бібліяграфічных ці іншых матэрыялаў, прысвечаных выдатным асобам. Напрыклад, ЦНБ НАН Беларусі, бібліятэкі ўніверсітэтаў – ствараюць бібліяграфічныя паказальнікі да юбілеяў дактароў навук. У некаторых з іх хроніка жыцця і дзейнасці становіцца самастойным раздзелам. Калі ёсць у адным дапаможніку нарыс жыцця і дзейнасці і хроніка, то ўзгадваемыя даты ў даволі значнай ступені будуць супадаць, але ў хроніцы павінна змяшчаць больш дат, якія не закрануты ў нарысе. Гэта значыць, што трапяць не самыя значныя даты жыцця чалавека. Пажадана ўключаць даты, звязаныя з сямейным жыццём чалавека.

У тым выпадку, калі дапаможнік не ўтрымлівае нарыса жыцця і дзейнасці, таму што замест яго могуць быць іншыя матэрыялы (успаміны сябра навукоўца і інш.), то тады гэты раздзел распрацоўваецца дэтальна.

2. Хронікі ўстаноў, арганізацый, калектываў ствараюцца і як самастойныя рэсурсы і як часткі інфармацыйных рэсурсаў больш шырокага зместу. Пры іх падрыхтоўцы важна вызначаць пачатковую дату гісторыі арганізацыі. Выяўлена некалькі варыянтаў вызначэння гэтай даты:

- Афіцыйная дата, якая ёсць у пастановах урада, рэгіянальных органаў улады аб заснаванні, адкрыцці арганізацыі.
- Пачатковай датай лічаць дату цэрымоніі афіцыйнага адкрыцця і, як правіла, гэта звязана з пачаткам функцыянавання, а для прадпрыемства – з выпускам першай прадукцыі бібліятэкі. Пры падрыхтоўцы такіх хронік часам змяняецца пункт гледжання на пачатковую дату.
- Пры падрыхтоўцы гэтых хронік выкарыстоўваецца інфармацыйная прадукцыя гэтых устаноў, іх сайты, перыядычныя выданні. Менавіта там выяўляюцца звесткі пра адкрыццё новых аддзелаў, пра пачатак ці завяршэнне навуковых тэм, пра выдатных супрацоўнікаў, выпуск новых прадуктаў і інш.

3. Шмат друкаваных выданняў прысвячаецца важным гістарычным падзеям, напрыклад, юбілейным датам Вялікай Айчыннай вайны. Частка гэтай прадукцыі мае характар хронік. Пры іх падрыхтоўцы трэба абгрунтаваць падзею і выявіць яе даты/звязаныя з імі падзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як правіла, зыходзяць з падзеі, актуальнай для сучаснага грамадства, н-д, важнай для вырашэння пэўных сацыяльна-культурных задач: грамадска-патрыятычнага выхавання і інш. Неабходна вызначаць пачатак і завяршэнне падзеі, затым у храналагічных межах ажыццяўляецца пошук асноўных дат і падзей. Калі падзея асвятляецца ў межах раёна, населенага пункта, горада, то акрамя розных публікацый, у т.л. мясцовага перыядычнага друку, неабходна праца з архіўнымі дакументамі, дакументамі музеяў, кансультацыі з музейнымі супрацоўнікамі і інш.

Хронікі падзей структуруюцца ў прамой паслядоўнасці выяўленых дат і змяшчаюць кароткія ці пашыраныя (пажадана) апісанні падзей.

4. Хронікі культурнага жыцця. Абласныя бібліятэкі Беларусі з'яўляюцца элементамі (звёнамі) у сістэме інфармацыі па культуры і мастацтве Беларусі. На працягу каля 50 год яны ствараюць хронікі культурнага жыцця абласцей.

*Напрыклад, Хроніка культурнага жыцця Магілёўскай вобласці.* Вып. 1-12 / Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, Аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры, Сектар краязнаўства ; [складальнік С.Ю. Пірагова]. 1 раз у месяц. – 3 экз. Штомесячнае выданне – хроніка асноўных падзей і фактаў культурнага жыцця вобласці прызначана для сістэматычнага інфармавання кіруючых работнікаў і спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва аб падзеях і фактах культурнага жыцця вобласці. Пры зборы матэрыялаў выкарыстоўваюцца фонды перыёдыкі, неапублікаванныя дакументы даведачна-інфармацыйнага фонду навуковай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва.

Штомесячнік «Хроника культурных событий г. Гомеля» - змяшчае пералік асноўных гарадскіх культурных мерапрыемстваў.

## Лекцыя 4. Методыка стварэння персанаграфічных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі

1. *Значэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі (ФІП) персанаграфічнага характару ў дзейнасці бібліятэк*
2. *Методыка падрыхтоўкі асобных тыпаў/жанраў ФІП*
3. *Узаемадзеянне з архівамі пры падрыхтоўцы ФІП*

### 1. *Значэнне ФІП персанаграфічнага характару ў дзейнасці бібліятэк*

На сучасным этапе бібліятэкі ўсіх тыпаў і відаў ствараюць разнастайную інфармацыйную прадукцыю, прысвечаную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобам/персаналіям. Выбар суб’ектаў для адлюстравання залежыць ад месца, ролі, бібліятэкі ў інфармацыйным працэсе краіны, раёна, галіны, задач і яе рэсурсаў. НББ і бібліятэкі іншых краін – рыхтуе бібліяграфічныя і фактаграфічныя рэсурсы пра нацыянальных аўтараў, выдатных дзеячоў краіны ў розныя гістарычныя перыяды.

Бібліятэкі рэспубліканскага ўзроўня – ствараюць інфармацыйную прадукцыю аб аўтарах галіны, вучоных. Рэгіянальныя публічныя бібілятэкі – аб мясцовых ураджэнцах і дзеячах. Бібліятэкі навуковых і навучальных устаноў – аб выкладчыках данай установы.

Персанаграфічную прадукцыю бібліятэк ствараюць і ў працэсе выканання фактаграфічных даведак аб асобах (біяграфічныя), па ўстанаўленні радаводу, частотных прозвішчаў.

Пры падрыхтоўцы фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў – бібліятэкі выбіраюць іх тып, жанр у залежнасці ад пастаўленых мэт і рэсурсных магчымасцей.

### *2. Методыка падрыхтоўкі асобных тыпаў/жанраў ФІП*

На сучасным этапе бібліятэкі ствараюць разнастайную ФІП персанаграфічнага характару. У складзе гэтай прадукцыі ёсць як класічныя жанры, так і параўнальна новыя.

Сярод асноўных жанраў распаўсюджаны:

- біябібліяграфічныя/персанальныя паказальнікі
- біябібліяграфічныя слоўнікі
- персанальныя энцыклапедыі
- малыя жанры (лістоўкі і інш.)

Новыя:

- Біябібліяграфічныя (персанаграфічныя) БД
- літаратурныя карты.
- Праекты (мульцімедыйныя рэсурсы).

У аснове любога персанальнага фактаграфічнага інфармацыйнага прадукты ляжыць даведка, або артыкул, якія адлюстроўваюць асноўныя біяграфічныя звесткі і з’яўляюцца асноўным элементам фактаграфічнага запісу любога ўзроўню. Фактаграфічныя даведкі аб персонах характарызуюцца варыятыўнасцю – г. зн. яны могуць быць як зусім кароткімі, сціслымі, уключаць мінімум звестак: імя, даты жыцця, род дзейнасці. У залежнасці ад мэты і задач, змест даведкі можа быць пашыраны. Абавязковым патрабаваннем з’яўляецца вызнчэнне мадэлі даведкі/артыкула – г.зн. пераліку істотных прымет, якія трэба адлюстраваць у ФЗ. Адступленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад макету паніжае якасць рэсурса. Максімальна фармалізуецца адлюстраванне персанальных даных пры стварэнні БД. Эфектыўным інструментам збору звестак аб асобах, дзейнасць якіх ажыццяўляецца ў сучасны час, з’яўляецца распрацоўка персанальнай анкеыт і іх распаўсюджанне сярод асоб, звесткі аб якіх будуць уключацца ў ФІР. Гэта эфектыўны спосаб пры падрыхтоўцы буйных друкаваных і электронных рэсурсаў, калі яны прысвячаюцца вучоным краіны, установы, рэгіёна, дзячам мастацтва, пісьменнікам, палітыкам і інш.

Для фактаграфічных дапаможнікаў, якія ствараюць публічныя бібліятэкі, характэрна менш жорсткая структураванасць тэксту, як правіла, яны пішуцца папулярным стылем.

Крыніцамі для персанаграфічных ФІП з’яўляецца шырокае кола першасных і другасных дакументаў. Гэта навуковыя выданні, гістарычныя першакрыніцы (мемуары, афіцыйныя дакументы), перыядычны друк і інш; бібліяграфічныя дапаможнікі розных форм і відаў). Асобую ролю адыгрываюць архіўныя дакументы і рэсурсы, створаныя на падставе архіваў, якія свабодна распаўсюджваюцца ў Інтэрнет.

Архівы: НГАБ, НАРБ, абласныя, занальныя і ведамасныя часам выступаюць партнёрам бібліятэкі пры падрыхтоўцы ФІП, напрыклад, Светлагорскай “Землякі”.

Архівы вядуць паказальнікі да фондаў (рукапісных, неапублікаваных дакументаў). Архівы Беларусі працуюць у агульнай праграме, таму вядуць і аднатыпныя паказальнікі. Сярод паказальнікаў вядзецца паказальнік імён, у які уключаюць асабістыя і калектыўныя імёны (назвы арганізацый, установ і інш.). Паказальнік дазваляе правесці пошук, калі вядома канкрэтнае імя.

НГАБ на сваім сайце змяшчае спіс родаў дваранскага саслоўя дарэвалюцыйнай Беларусі.

На сучасным этапе ў Інтэрнэце змяшчаюцца крыніцы масавай інфармацыі аб насельніцтве і арганізаваны свабодны доступ да вельмі буйных масіваў даных. Н-д, “Всероссийское генеалогическое древо” дазваляе выяўляць факты пра асоб, звязаных з Беларуссю, адшукваць землеўласнікаў розных беларускіх тэрыторый у мінулым, шукаць асобу па прозвішчы, імені і іншых прыметах.

Буйныя рэсурсы масавай інфармацыі прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, напрыклад, “Памяць народа”, “Мемарыял і інш. Гэта адкрытыя банкі даных і электронныя калекцыі, забяспечваюць пошук звестак пра ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны. Заснаваны ан велізарных па аб’ёме архіўных дакументах, картаграфічных матэрыялах, фотадакументах. Забяспечваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хуткі пошук, каштоўна, што вынікі пошуку пры жаданні карыстальніка падцвярджаюцца копіямі дакументаў.

*2.Методыка падрыхтоўкі асобных тыпаў/жанраў ФІП*

**1. Біябібліяграфічныя слоўнікі** – буйныя дапаможнікі, якія адлюстроўваюць дзеячаў галіны, роду заняткаў, установы і інш. Ствараюцца бібліятэкамі ўсіх тыпаў. Пры іх падрыхтоўцы важна дакладна акрэсліць крытэрыі адбору імён, для таго, каб поўна забяспечыць выяўленне імён згодна гэты крытэрыям. Напрыклад, будзе вызначана, што ў біябібліяграфічны слоўнік будуць уключацца пісьменнікі, якія з'яўляюцца членамі пісьменніцкіх арганіазцый, або асобы, якія працавалі ў пэўнай навуковай ці адукацынай установе не менш 3 год.

Выяўленне асоб вядзецца па розных крыніцах: друкаваных бібліяграфічных дапаможніках, БД, даведачных выданнях, перыядычных выданнях, па архіўных фондах і інш., часам збіраюцца ўспаміны ад родных, сяброў і былых калег, вучняў.

Структура фактаграфічнага запісу аб кожнай асобе, як правіла, шматузроўневая. Загаловак запісу:

- поўнае імя, даты жыцця, звесткі аб прафесійных, творчых дасягненнях (прафесар, доктар навук, заслужаны дзеяч навукі),
- фактаграфічная даведка/артыкул, які ствараецца на падставе ўніфікаванай мадэлі і дастаткова поўна і дакладна перадае даты і падзеі біяграфіі ў прамой храналогіі.
- бібліяграфічны спіс. Звычайна ўтрымлівае некалькі назваў асноўных публікацый асобы і публікацыі, прысвечаныя дзеячу. У электронных ФІР часцей сустракаецца прывядзенне спісаў усіх выяўленых твораў асоб і публікацый аб іх.
- ілюстрацыйны матэрыял (мінімум – фатаграфія).

Усе падрыхтаваныя фактаграфічныя запісы могуць размяркоўвацца ў:

- алафавітнай паслядоўнасці,
- храналагічнай паслядоўнасці (па гадах нараджэннях),
- па гістарычных перыядах (унутры алфавіт).

Напрыклад, біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі " у 6-ці тт., (1992-1995) утрымлівае 1100 артыкулаў з поўнымі, усебаковымі і сістэматызаванымі звесткамі пра жыццё і дзейнасць усіх прадстаўнікоў беларускай літаратуры, якія пісалі на стараславянскай, беларускай, рускай, лацінскай, польскай і іншых мовах Беларусі. У бібліяграфічных спісах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлена звыш 600 000 розных публікацый. Рэдактарам выдання быў славуты гісторык літаратуры прафесар Адам Мальдзіс.

Выдатным прыкладам біябібліяграфічнага слоўніка, складзенага публічнай бібліятэкай, можа быць “Земляки: История Светлогорска в лицах”, Светлагорскай ЦГБ. Дапаможнік створаны на аснове БД “Знаменитые люди города”. З метадычнага пункту гледжання дапаможнік заслугоўвае высокай ацэнкі і з’яўляецца інавацыйным прадуктам. У прыватнасці, для выяўлення асоб і біяграфічных даных праведзена вялікая пошукавая работа, сабраны даныя з друкаваных крыніц, выкарыстана інфармацыя, прадстаўленая аддзеламі кадраў прадпрыемстваў і ўстаноў горада, музеем гісторыі Светлагорска, матэрыялы перапіскі і вусныя звесткі, атрыманая падчас асабістых сустрэч з вядомымі людзьмі складальніцы слоўніка Г.І. Захаранка. Дапаможнік станоўча вызначаецца якасцю прадмовы, інфармацыйнай насычанасцю, акцэнтаваннем увагі на ролі чалавека ў жыцці горада – што ўдаецца не ўсім стваральнікам падобнай прадукцыі. Шэраг даведак упершыню прадстаўляюць звесткі аб асобе ў выглядзе дакументаванага тэкста. Усе групы бібліяграфіруемых матэрыялаў і крыніц інфармацыі чотка структураваны, дадаткова маркірюцца ўмоўнымі знакамі. Біябібліяграфічны даведак якасна аформлены: афсетны друк, шмат вершаваных эпіграфаў, партрэтныя, групавыя і відавыя фотаздымкі гараджан і г. Светлагорска. Светлагорскай ЦГБ створаны ўзор каштоўнай крыніцы ведаў і інфармацыі, з дапамогай якой магчыма пераадолець рассянасць персаналій, існуючую як у дакументным патоку, так і ў сістэматычных карткавых краязнаўчых картатэк.

**2. Біяграфічныя даведнікі** таксама рыхтуюцца многімі бібліятэкамі, ахопліваюць дзеячаў па роду заняткаў, тэрыторыі і інш. Праяўляюць значную цікавасць да іх бібліятэкі УВА. Пры іх падрыхтоўцы збіраюцца ўніфікаваныя звесткі аб выкладчыках і навуковых супрацоўніках. Бібліяграфічныя спісы ў гэтых дапаможніках могуць прысутнічаць, але часам не ўключаюцца.

**3. Біябібліяграфічныя (персанаграфічныя) БД.** Прысвячаюцца вучоным краіны, навуковых і навучальных устаноў, дзеячам літаратуры і мастацтва і інш. У РБ вядуцца НББ, ЦНБ НАН Беларусі, універсітэцкімі, абласнымі і іншымі бібліятэкамі.

У аснове любой БД персаналій ляжаць 2 віды звестак:

- амаль нязменныя або статычныя звесткі (дата нараджэння, пол, пасады, асноўныя біяграфічныя звесткі)
- дынамічныя звесткі, якія змяняюцца (аб званнях, аб атрыманні вучоных ступеняў, узнагародах).

Сабраную інфармацыю падзяляюць на 3 групы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. біяграфічныя (даты жыцця, навучанне, парца, сямейнае становішча, узнагароды).
2. Даты розных пазей у жыцці чалавека.
3. Бібліяграфічныя даныя.

Праграмы персанальных БД дазваляюць ствараць некалькі падбаз, прадстаўляць АВ-матэрыялы, выкарыстоўваць гіперспасылкі.

У Беларусі да ліку лепшых фактаграфічных БД можна аднесці "Вучоныя Беларусі" НББ.

У БД "Беларусь у асобах і падзеях" – назапашваецца інфармацыя актуальнай тэматыкі пра асоб, якія ўнеслі адметны ўклад у развіццё Беларусі і пра падзеі гістарычнага значэння.

Склад асоб самы шырокі – гэта дзеячы навукі, культуры, эканомікі, літаратуры, спорта і іншыя, якія звязаны з Беларуссю месцам нараджэння ці сваёй дзейнасцю. Добра распрацавана структура персанальных даведак. Уключаюцца ўсе выяўленыя варыянты імёнаў на беларускай, рускай і замежных мовах, а таксама псеўданімы, крыптонімы, духоўныя і свецкія імёны, даты жыцця, месца нараджэння, род дзейнасці, званні, прэміі і інш. пералічаны тэрыторыі, з якімі звязана жыццё і дзейнасць асобы.

Адлюстраваны важнейшыя гістарычныя падзеі: грамадска-палітычныя эканамічныя, культурныя. Прыведзены звесткі пра ўстановы, арганізац, прадпрыемствы, аб'екты аховы прыроды рэспубліканскага значэння. Інфармацыя выяўляецца па аўтарытэтных крыніцах. Падаюцца назвы падзей на беларускай, рускай і замежных мовах. Прыводзяцца даты, указваюцца населеныя пункты і ўдзельнікі падзей.

На падставе БД ствараецца электронны Беларускі каляндар на год і каляндар, які змяшчаецца ў Новых кнігах: па старонках беларускага друку".

БД змяшчае АВ, спасылкі на Інтэрнэт-рэсурсы, бібліяграфічную інфармацыю, да алічбаваных тэкстаў у НББ.

**Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў** з'яўляецца адным з важнейшых кампанентаў інфармацыйнага і лінгвістычнага забеспячэння электроннага каталога. Аўтарытэтныя / нарматыўныя файлы з'яўляюцца пошукавымі элементамі да бібліяграфічных запісаў дакументаў, якія ўваходзяць у склад электронных каталогаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і бібліятэк - удзельніц сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі.

Аўтарытэтныя / нарматыўныя запісы - гэта пошукавыя элементы бібліяграфічных запісаў (імёны аўтараў і персаналій, радавыя імёны), прадстаўленыя па пэўных правілах. Аўтарытэтныя запісы адназначна ідэнтыфікуюць імёны, што дазваляе з аднаго боку, улічыць пры пошуку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі ўсе варыянты імён, а з другога – размежаваць аднолькавыя прозвішчы.

Аўтарытэтны файл на імёны з’яўляецца элементам падбазы нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў. Утрымлівае важнейшыя звесткі пра людзей розных гістарычных эпох, любых прафесій і заняткаў, якія адносяцца да беларускіх нацыянальных аўтараў. Як правіла прыводзяцца наступныя звесткі: поўнае імя на афіцыйных мовах краіны (беларускай, рускай), напісанне яго імя ў транслітэрацыі на замежных мовах, указваюцца варыянты імёнаў, пад якімі ён друкаваўся, псеўданімы і іншыя спосабы прадстаўлення сябе ў друку. Падаюцца гады жыцця, месца жыцця, прафесіі, заняткі, пасады, ганаровыя званні, узнагароды і іншыя важныя звесткі, творы.

Гэтыя звесткі бяруцца з аўтарытэтных крыніц: энцыклапедый, даведнікаў, навуковых выданняў, часам з асабістых дакументаў і іншых крыніц. Аўтарытэтныя запісы не з’яўляюцца цалкам статычным матэрыялам, але наадварот, гэты рэсурс знаходзіцца ў пастаяннай дапрацоўцы, таму што навука ўносіць новыя адкрыцці, удакладненні ў біяграфію, даныя, звязаныя з творчасцю і гэтыя звесткі павінны ўключацца замест недакладных.

У наш час пад кіраўніцтвам ІФЛА падрыхтаваны міжнародныя аўтарытэтныя запісы на імёны аўтараў.

Біяграфічная фактаграфія ў іншых БД: прадстаўляецца ў многіх іншых БД (тэматычных, камбінаваных і інш.). Напрыклад, “Край мой, Магілёўшчына”, “Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць”, “Кампазітары Гомельшчыны” (лакальная) і інш. Магілёўская АБ. «Таленты ад роднай зямлі» - фактаграфічная літаратурна-краязнаўчая база даных «Таленты ад роднай зямлі».

Пошук персаналій і па геаграфічных назвах.

Створана з мэтай прэзентацыі літаратурнага жыцця Магілёўскай вобласці, літаратурнай адукацыі насельніцтва, распаўсюджвання ведаў аб ролі сваёй радзімы ў культурным жыцці краіны і далучэння да духоўных каштоўнасцяў рэгіёну. Аснову базы складаюць матэрыялы, прадстаўленыя супрацоўнікамі цэнтральных раённых бібліятэк Магілёўскай вобласці. Рэсурс змяшчае звесткі аб 357 персаналіях – пісьменніках, паэтах, літаратуразнаўцах – ураджэнцах Магілёўскай вобласці і звязаных з ёй сваім жыццём і творчасцю – і з’яўляецца абагульненнем інфармацыі аб літаратурных традыцыях Магілёўшчыны. Біяграмы ўтрымліваюць біяграфічную, фактаграфічную і бібліяграфічную інфармацыю як аб заснавальніках беларускай літаратуры, так і сучасных пісьменніках і паэтах. Па меры паступлення інфармацыі база даных будзе дапаўняцца новымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звесткамі.Прыведзены толькі фактаграфічныя звесткі аб: 1) імя на беларускай мове, 2) гады жыцця і месца нараджэння 3) творчая накіраванасць, тэматычны жанр, 4) звесткі аб узнагародах, званнях. Імя на рускай мове, псеўданімы, творчасць, спісы асобна выдадзеных кніг і зборнікаў, звесткі пра публікацыі ў зборніках, перыядычных выданнях; інтэрнет-рэсурсы.

4. **Літаратурная карта (ЛК).** Гэта праекты, мэтай якіх з’яўляецца найбольш поўнае адлюстраванне жыцця і творчасці пісьменнікаў вобласці, раёна, горада і літаратурнага працэсу ў межах выбранай тэрыторыі. З’яўляюцца даступнымі інфармацыйнымі рэсурсамі для шырокіх колаў аматараў мастацкай літаратуры, а таксама прафесіянальных і аматарскіх літаратараў, студэнтаў, выкладчыкаў, журналістаў, крытыкаў, літаратуразнаўцаў, краязнаўцаў, літаратурных арганізацый.

ЛК ажыццяўляюцца бібліятэкамі нярэдка разам з пісьменніцкімі арганізацыямі рэгіёна.

На галоўных старонках ЛК размяшчаюць інтэрактыўныя карты абласцей/раёнаў. Нанесеныя геаграфічныя аб’екты – актыўныя спасылкі да пэўных літаратурных імёнах, звязаных з данай тэрыторыяй.

На галоўных старонках прыводзяцца агульныя звесткі аб праектах, прадстаўляюцца раздзелы - паказальнікі: персаналіі (паказальнік), памятныя месцы (паказальнік), геаграфічны паказальнік, раздзел “біяграфічнае краязнаўства”. Раздзелы: літаратурныя альманахі, часопісы; літаратурныя прэміі, конкурсы, узнагароды; літаратурныя аб’яднанні; літаратурныя святы; літаратурныя чытанні, чытальная зала і інш..

Розным колерам адзначаюцца раздзелы, рубрыкі, асобныя аб’екты, на якія створаны фактаграфічныя запісы і на тыя, якія яшчэ не напоўнены звесткамі.

Літаратурная карта – на якіх адзначаны населеныя пункты, звязаныя з літаратурным працэсам у рэгіёне. Аб’ектамі адлюстравання з’яўляюцца:

- сам рэгіён і асобныя населеныя пункты, звязаныя з літаратурным працэсам;
- дзеячы літаратуры: пісьменнікі, літаратурныя крытыкі, літаратуразнаўцы, арганізатары (рэдактары, выдаўцы) літаратурна-мастацкіх выданняў, літаратурных прэмій, кіраўнікі літаратурных арганізацый і іншыя асобы;
- помнікі, якія сталі ўвасабленнем памяці аб выдатных літаратурных з’явах;
- літаратурныя творы.

Фактаграфічныя запісы ў ЛК – шматузроўневыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Структура:*

Сама карта рэгіёна з нанесенымі пасяленнямі, якія з’яўляюцца пунктамі ўваходу да азнаямлення з лакальнымі літаратурнымі з’явамі.

Аб раёнах даюцца агульныя гістарычныя звесткі: аб даце ўтварэння раёна, у асноўным прыводзяцца звесткі на сучасны час: аб колькасці насельніцтва, плошчы, галінах эканомікі, прыводзяцца імёны дзеячаў літаратуры, звязаных з раёнам. У якасці ілюстрацыі ў даведцы прыводзяць герб раёна.

Пасля даведкі пра раён даецца пералік населеных пунктаў, дзе адбываліся літаратурныя з’явы. Пераход на назвы гэтых аб’ектаў адкрывае фактаграфічныя запісы аб гэтых пасяленнях. У даведцы прыводзяць звесткі аб тыпе данага пасялення сёння і ў мінулым, яго назвах у мінулым, калі назвы змяняліся. Характарыстыка самога пасялення даецца пераважна па стану на час, звязаны з асобай пісьменніка, ці з іншай літаратурнай з’явай. Безумоўна, ўказваюцца і звесткі аб узнікненні пасялення, бацьках ці іншых продках пісьменніка, каротка прыводзяцца звесткі аб асноўных вехах гісторыі пасялення да сённяшніх дзён. Напрыклад, сучасны статус пасялення, эканамічныя, культурныя і іншыя аб’екты на яго тэрыторыі. Заключаюць даведку бібліяграфічным спісам, які можа быць анатаваным. У даведачных анатацыях мэтазгодна адзначыць выкарыстанне архіўных дакументаў у прыведзеных публікацыях. Па гіперспасылках адбываецца пераход ад імён пісьменнікаў ці іншых літаратурных з’яў, узгаданых у фактаграфічных даведках да фактаграфічных даведак аб гэтых персонах ці іншых літаратурных з’явах.

Навігацыя і пошук ажыццяўляюцца па розных раздзелах. Галоўную ролю ў пошуку выконваюць паказальнікі: геаграфічны, персаналій.

ЛК – пастаянна папаўняюцца даведачнай інфармацыяй, фотаматэрыяламі, бібліяграфічнымі звесткамі і іншай інфармацыяй.

Паказальнік персаналій ці імянны (ці біяграфічныя звесткі) утрымлівае пералік імён дзеячаў літаратуры, з разгорнутай біяграфічнай даведкай і гіперспасылкамі да іншых аб’ектаў: геаграфічных назваў і інш. Указваюцца гады жыцця асобы, партрэт, фотаздымкі. Акцэнт у біяграфічнай даведцы робіцца на характарыстыцы творчай дзейнасці, прыводзяцца звесткі аб пачатку творчай дзейнасці. Даецца інфармацыя аб займаемых пасадах, месцах працы, месцах жыхарства. Біяграфічная даведка можа мець гіпертэкставыя спасылкі, што можа значна пашырыць адлюстраванне асобы пісьменніка. Даюцца спасылкі і да тэкстаў твораў пісьменнікаў ці іх урыўкаў (пры наяўнасці).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таксама прыводзяцца бібліяграфічныя спіскі, якія дазваляюць пазнаёміцца з публікацыямі аб пісьменніках, у т.л. літаратуры аб жыцці і творчасці, літаратура аб асобных творах і зборніках, бібліяграфічныя дапаможнікі

Геаграфічны паказальнік – змяшчае пералік назваў населеных пунктаў рэгіёна, пераход па ссылцы прадстаўляе фактаграфічныя даведкі аб кожным з іх, з указаннем імён дзеячаў літаратуры. Аздабляецца фотаздымкамі. Імянны і геаграфічны паказальнікі узаемазвязаны (выконваюцца пераходы па ссылках).

Раздзел "Памятныя месцы" – змяшчае пералік музеяў, помнікаў, мемарыяльных дошак і вуліц, названых імёнамі пісьменнікаў. Змяшчае гістарычныя звесткі, фотаздымкі.

Раздзел "Літаратурныя чытанні" – змяшчае алфавітны пералік літаратурных чытанняў – гэта навуковыя канферэнцыі, якія адбываюцца ў асобных гарадах. Прадстаўлена карта з гарадамі, дзе адбываліся даныя чытанні ці дзе жыў пісьменнік.

Раздзел "Літаратурныя прэміі" – утрымлівае спіс літаратурных прэмій. Аб кожнай даецца яе гісторыя, характарыстыка і спіс пісьменнікаў-лаўрэатаў.

Раздзел "Чытальны зал" – змяшчае алфавітны пералік аўтараў і назваў іх твораў, якія можна пачытаць (лічбавыя копіі).

Вельмі добра, калі рэсурс забяспечвае зручны пошук, у т.л. і па вольнай камбінацыі ключавых слоў.

Размяшчэнне ЛК. Для афармлення карты патрэбны ўступ, дзе будзе раскрыта прызначэнне рэсурса, яго метадычныя асаблівасці: у т. л. характарыстыка асноўных раздзелаў рэсурса, групоўка і характарыстыка біяграфічных даведак, звесткі аб кансультантах праекта і распрацоўшчыках рэсурса, сродках, на якія ён рэалізаваны.

Літаратурныя карты актыўна генерыруюцца абласнымі навуковымі і публічнымі бібліятэкамі Расіі. У Беларусі бібліятэкі пачынаюць развіваць гэтыя рэсурсы. Адным з лепшых з'яўляецца "Літаратурная карта Гомельшчыны" Гомельскай АУБ.

**5. Мульцімедыйныя персанальныя рэсурсы**. Рыхтуюць бібліятэкі да юбілеяў знакамітых асоб. Сінтэзуюць розныя віды інфармацыі, фактаграфічная адыгрывае вельмі значную ролю. Прыкладам аднаго з лепшых з'яўляецца ресурс "Юзеф Игнаций Крашевский" створаны Брэсцкай абласной бібліятэкай разам з НББ і замежнымі партнёрамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка лабараторных заняткаў

| № п/п | Назва тэмы | Від заняткаў і колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Методыка хранікальных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі | 4 гадзіны, лабараторная работа |
| 2. | Падрыхтоўка паведамлення для стужкі навін | 2 гадзіны, лабараторная работа |
| 3. | Фактаграфічныя базы даных | 4 гадзіны, лабараторная работа |
| **Усяго: 4 г. –лабараторныя заняткі** | | |

## 3.2 Тэматыка курсавых работ

1.Фактаграфічныя базы даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: метадычныя асаблівасці і выкарыстанне.

2. Фактаграфічныя базы даных рэспубліканскіх навуковых бібліятэк Беларусі: метадычныя асаблівасці і выкарыстанне.

3. Фактаграфічныя базы даных абласных бібліятэк Беларусі: метадычныя асаблівасці і выкарыстанне.

4. Фактаграфічная інфармацыйная прадукцыя публічных бібліятэк: метадычныя асаблівасці і выкарыстанне.

5. Падрыхтоўка фактаграфічнага даведніка па тэме (тэма ўзгадняецца са студэнтам).

6. Стварэнне тапанічных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў як кірунак пошукава-даследчай дзейнасці публічных бібліятэк.

7. Стварэнне фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў па сямейна-родавай гісторыі як кірунак пошукава-даследчай дзейнасці публічных бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Тэматыка лабараторных заняткаў

### ЛАБАРАТОРНАЯ РАБОТА № 1

### па тэме “ПАДРЫХТОЎКА ПАВЕДАМЛЕННЯ ДЛЯ СТУЖКІ НАВІН”, 2 гадзіны

*Мэта:* Стварэнне паведамлення для стужкі навін.

*Выкананне:* работа праводзіцца ў бібліятэцы БДУКМ ці Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Студэнты знаёмяцца з:

1) навінамі, размешчанымі на афіцыйных сайтах бібліятэк (па выбару), аналізуюць структуру некалькіх навін і іх стыль. Звяртаецца ўвага на ўключэнне выказванняў (цытат) аўтарытэтных асоб падчас мерапрыемстваў, якім прысвечана навіна; на аб’ём паведамленняў (колькасць сказаў).

2) на падставе часопіснага ці газетнага артыкула ствараюць адну навіну для пэўнага тыпа бібліятэкі. Выкарыстоўваюць метад згортвання інфармацыі, выбіраюць моўны стыль. Ствараюць тэкст навіны, вызначаючы:

- дату стварэння навіны;
- загаловак навіны, які можа ўключаць дату падзеі;
- апісанне падзеі: калі, дзе і што адбудзецца/адбылося; хто быў удзельнікам падзеі; як адбывалася падзея; чаму яна адбылася (адбудзецца); яе значнасць;
- у канцы навіны можа быць указанне/спасылка на магчымасць азнаёміцца больш падрабязна з іншымі матэрыяламі па тэме. Спасылка можа быць выражана словамі: тут, глядзі, падрабязна, здесь (рус.).

Тэкст навіны можа змяшчаць да 10 сказаў.

Вынікі работа правяраюцца выкладчыкам і абмяркоўваюцца са студэнтамі.

*ЛІТАРАТУРА*

Новостные ленты // Справочник библиографа. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С. 598-601.

Особенности составления и подачи информационных материалов на сайт библиотеки: методические рекомендации в рамках Школы повышения компьютерной грамотности / ГУК «Централизованная библиотечная сеть Быховского района», Отдел библиотечной рекламы и маркетинга : [составитель И. А. Маргунова; редактор Т. Т. Коржова ; ответственный за выпуск Н. А. Корзо]. – Быхов : Центральная районная библиотека им. Б. В. Стрельцова, 2017. – 17с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛАБАРАТОРНАЯ РАБОТА № 2

## па тэме “ФАКТАГРАФІЧНЫЯ БАЗЫ ДАНЫХ”, 2 гадзіны

*Мэта:* Азнаямленне з фактаграфічнымі базамі даных “Вучоныя Беларусі”, “Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; “Белорусские имена в мировой науке и технике” РНТБ, “История белорусской науки в лицах” ЦНБ НАН Беларусі.

*Заданні і выкананне:* работа праводзіцца ва ўмовах бібліятэкі. Студэнты знаёмяцца з праграмным забяспячэннем БД і створанымі рэсурсамі. Выяўляюцца і характарызуюцца тыпы аб’ектаў, тэхналогія стварэння фактаграфічнага запісу і яго ўзроўні, запаўненне пошукавых палёў, магчымасці фактаграфічнага і бібліяграфічнага пошуку, афармленне БД.

1. <u>“Вучоныя Беларусі”.</u>

- Прачытаць “Анкету участника базы данных “Ученые Беларуси”.
- Увайсці ў БД.
- Выбраць імя вучонага (н-д, выкладчыкаў ФІДК; ці, н-д, Вардамацкі Л., Рассадзін С.), прачытаць прадстаўленыя звесткі: варыянтныя формы імя, звязаныя даныя (аб установах, звязаных з дзейнасцю вучонага; крыніцах інфармацыі – звярнуць увагу на віды крыніц інфармацыі).
- Перайсці да біяграфічнай даведкі, прачытаць, адзначыць, якія звесткі прыводзяцца (біяграфічныя, аб навуковых інтарэсах, самастойна вызначыць іншыя).
- Правесці пошук па прозвішчах Гераськіна Т., Груша А., Чыкава Т., Бойка В. Ці прадстаўлены гэтыя вядомыя вучоныя ў БД?
- Прыняць удзел у запаўненні “Анкеты участника базы данных “Ученые Беларуси” на імёны выкладчыкаў ФІДК, якія не прадстаўлены ў БД.

2. <u>Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі</u>. Адкрыць “Профессионалам”, выбраць злева ўнізе “Авторитетные записи”→ “Словари” →”Географическое название”. Увесці ў пошукавы радок “Скідзель” (ці любы аб’ект па ўласным выбары), націснуць знак фактаграфічнай даведкі і прачытаць яе. Выканаць падобны пошук на слоўніку: “Имя лица”, “Родовое имя” (н-д, Радзівіл).

Зрабіць выснову аб магчымасцях прымянення слоўнікаў “Авторитетных записей” ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні.

3. <u>БД “Белорусские имена в мировой науке и технике”.</u>

Выбраць “Поиск по словарям” → Просмотр/поиск по словарю «Область деятельности» → напрыклад, астраномия, з пераліку імён

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

астраномаў выбраць аднаго вучонага (Блажко, Тихов ці інш.), якія віды фактаграфічных запісаў характарызуюць жыццё і дзейнасць вучоных?

Якія віды інфармацыйных рэсурсаў адлюстраваны ў крыніцах інфармацыі (“источники”) аб вучоных?

Прагледзець і выкарыстаць для пошуку “Список”, які адкрываецца пасля націску на “Поиск по словарям”.

4. “История белорусской науки в лицах” ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.

- Прывесці асноўныя біяграфічныя звесткі аб адным з беларускіх вучоных, напрыклад, Я. Наркевічу-Ёдка, А. Амбросаве ці інш.
- Прывесці звесткі аб навуковай праблематыцы, якую даследаваў вучоны.
- Укажыце ўзнагароды, якімі адзначана навуковая праца вучонага.
- Назавіце 1-2 навуковыя працы (кнігі) вучонага.

Вынікі работа правяраюцца выкладчыкам і абмяркоўваюцца са студэнтамі.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Ахремчик, Р. В. Электронные персональные указатели серии "История НАН Беларуси в лицах": от библиографических списков к полным текстам / Р.В. Ахремчик, Т.В. Пинчук [Электронный ресурс] – URL: library.basnet.by/simple-search?filterquery=Ахремчик%2C+Регина+Вацлавовна&filtername=author&filtertype=equals.
2. Бушило, Л. БД "Ученые Беларуси” как инновационный корпоративный ресурс библиотек Беларуси / Лариса Бушило, Татьяна Кузьминич // Бібліятэчны свет. — 2013. — № 4. — С. 9—11.
3. Бушило, Л.Л. Географические названия как объект отражения в национальной БД авторитетных записей / Бушило Л. Л., Сокол Т. Ф. // Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: праблемы фарміравання і выкарыстання: зборнік артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; [складальнік Т. В. Кузьмініч; рэдкалегія : Л. Г. Кірухіна і інш.] — С. 151—165.
4. Ильина, С.В. Корпоративная база авторитетных данных библиотек Беларуси в национальном аспекте / Ильина С. В., Бушило Л. Л. // Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі: зборнік артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; [складальнік Т. В. Кузьмініч; рэдкалегія: Л. Г. Кірухіна і інш.] — С. 204—216.
5. Кузьминич, Т. В. Фактографические базы данных Национальной библиотеки Беларуси: новый этап развития / Т. В. Кузьминич // Развитие

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

информатизации и государственной системы научно-технической информации : РИНТИ–2009 : VIII Международной конференции, 16 ноября 2009 г. – Минск, 2009. – С. 200–204.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 4.2 Заданне для самастойнай работы студэнтаў у меэсесійны перыяд

Самастойная работа дапамагае арганізаваць раўнамерную дзейнасць студэнтаў па вывучэнні прадмета, больш глыбока і грунтоўна засвоіць яго і глыбей засвоіць метадычныя і тэхналагічныя пытанні падрыхтоўкі ФІР.

### Тэма: ПАДРЫХТОЎКА АГЛЯДУ КРАЯЗНАЎЧЫХ ФАКТАГРАФІЧНЫХ ВЫДАННЯЎ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК

**Заданне** – студэнт рыхтуе агляд фактаграфічных выданняў пэўнай публічнай бібліятэкі (цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы), выбар бібліятэчнай установы ўзгадняецца з выкладчыкам. Для студэнтаў, якія працуюць у бібліятэках, пажадана падрыхтоўка агляду на аснове гэтых устаноў. Мэта агляду прааналізаваць значэнне стварэння фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў дзейнасці бібліятэкі, яе формы, жанры, тэматыку і методыку. Пры падрыхтоўцы агляду звярнуць увагу на:

-колькасныя паказчыкі фактаграфічных матэрыялаў у складзе інфармацыйнай прадукцыі бібліятэкі,

- актуальнасць падрыхтоўкі фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў (іх неабходнасць можа быць выклікана многімі фактарамі: грамадскай значнасцю і попытам карыстальнікаў, недахопам інфармацыі ў іншых крыніцах і г. д.),

- звесткі аб стваральніках (структурныя падраздзяленні, асобныя спецыялісты бібліятэкі),

- формы (электронна-фарматныя, электронна-тэкставыя), друкаваныя; жанры (даведнікі, пуцевадзіцелі і інш.),

- тэматыка,

- методыка (адбору аб’ектаў адлюстравання, іх характарыстыкі, уніфікаванасці (мадэлявання фактаграфічных звестак), узроўні ФЗ, моўныя стылі, камплексіравання відаў інфармацыі), групоўкі фактаграфічных запісаў (ці звестак пра фарматы для электронна-фарматных ЭІР), афармленне і інш. Могуць быць адзначаны выяўленыя недахопы (метадычныя, моўныя, афармлення),

- прыклады ці магчымасці выкарыстання ў бібліятэчнай практыцы.

*КРЫНІЦЫ*

1. Фактаграфічныя выданні (БД), выяўленыя студэнтам самастойна ў бібліятэчных установах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Стрыжонак, І.М. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства : тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

**Форма кантролю**

Праверка і абмеркаванне матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.3**

## 4.3 Пытанні і заданні па вучэбнай дысцыпліне “Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы” да заліку

1. Аб’екты фактаграфічнай інфармацыі.
2. Персанаграфічныя жанры фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі бібліятэк.
3. Метадычныя асаблівасці бібліятэчных календароў.
4.
5. Метадычныя асаблівасці краязнаўчых дас’е.
6. Метадычныя асаблівасці краязнаўчых пуцевадзіцелей.
7. Метадычныя асаблівасці літаратурных карт.
8. Метадычныя асаблівасці фактаграфічных даведнікаў (аб населеных пунктах, тапанімічных, геральдычных і інш.).
9. Метадычныя асаблівасці хранікальных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі .
10. Падрыхтаваць план-макет для прапанаванага аб’екта.
11. Падрыхтаваць фактаграфічную даведку аб прапанаванай персоне.
12. Падрыхтаваць фактаграфічную даведку аб прапанаванаму геаграфічнаму аб’екту.
13. Падрыхтоўка стужак навін (Newswires) у бібліятэцы.
14. Паняцце “фактаграфічная інфармацыя” і яе сутнасць.
15. Паняцці “фактаграфічная інфармацыя”, “фактаграфічныя інфармацыйныя рэсурсы”, “фактаграфічная інфармацыйная прадукцыя”.
16. Скласці паведамленне для стужкі навін (Newswires) на падставе прапанаванага органа СМІ.
17. Тыпалагічная фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі бібліятэкі.
18. Тэхналогія фактаграфічных баз даных.
19. Уласцівасці фактаграфічнай інфармацыі.
20. Фактаграфічная даведка як галоўны элемент краязнаўчай фактаграфічнай прадукцыі. Выбар моўнага стылю.
21. Фактаграфічны запіс: яго віды і спосабы стварэння фактаграфічнага паведамлення (тэксту).
22. Фактаграфічны запіс: спецыфіка і характарыстыка ўзроўняў.
23. Фактаграфічны характар нацыянальных аўтарытэтных даных (імён аўтараў і персаналій, геаграфічных назваў і інш.).
24. Фактаграфічныя БД Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Аўтарытэтных запісаў, “Вучоныя Беларусі”, “Беларусь у асобах і падзеях”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

25. Фактаграфічныя рэсурсы галіновых рэспубліканскіх бібліятэк Беларусі.

26. Фактаграфічныя рэсурсы ЦНБ НАН Беларусі (“История белорусской науки в лицах”).

27. Формы фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў і іх асноўныя групы.

28. Характарыстыка фактаграфічных звестак у базе даных “Вучоныя Беларусі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

### Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца па дысцыпліне

Для ажыццяўлення кантролю ведаў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступны дыягнастычны інструментарый: праверка заданняў выкананых на лабараторных работах і самастойна ў межсесійны перыяд, залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Вучэбная праграма дысцыпліны

### ЗМЕСТ КУРСА

### Уводзіны

Мэты, задачы вучэбнай дысцыпліны "Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы". Яе значэнне і месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнавуковага і прафесійнага цыклаў. Забяспечанасць тэарэтычнай, вучэбнай і метадычнай літаратурай.

Структура вучэбнай дысцыпліны. Характарыстыка асноўных праблем, вывучаемых у яе межах. Асноўныя формы аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

### Тэма 1. Тэарэтычныя пытанні стварэння фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі

Фактаграфічная інфармацыя як разнавіднасць другаснай фактаграфічнай інфармацыі і частка нацыянальных/рэгіянальных фактаграфічных рэсурсаў (прадукцыі).

Аб'екты фактаграфічнай інфармацыі: геаграфічныя назвы, персаналіі, арганізацыі, установы, статыстычныя даныя, падзеі, даты, адрасныя звесткі і інш.

Уласцівасці фактаграфічнай інфармацыі: фрагментарнасць (выбарнасць) аб'ектаў адлюстравання, аднатыпнасць, строгая ўпарадкаванасць элементаў (запісаў), хуткасць пошуку інфармацыі, дакладнасць звестак, аператыўнасць папаўнення (карэкціроўка, замена), адсутнасць факталагічнага аналізу і аўтарскай інтэрпрэтацыі аб'ектаў адлюстравання, мэтазгоднасць і спосабы камлексіравання фактаграфічнай інфармацыі з іншымі відамі сацыяльнай інфармацыі.

### Тэма 2. Асаблівасці фактаграфічнага запісу ў розных жанрах інфармацыйнай прадукцыі

Метады выяўлення аб'ектаў фактаграфічнай інфармацыі ў дакументах (тэкстах), электронных рэсурсах, нацыянальных і замежных фактаграфічных рэсурсах, крыніцах вуснай гісторыі. Вызначэнне аўтарытэтнасці крыніц (навізны і навуковай абгрунтаванасці, дакладнасці матэрыялу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лагічная перапрацоўка знойдзенай фактаграфічнай інфармацыі. Апісанне факта, распрацоўка структуры апісання. Ідэнтыфікацыя тыпа асобных аб'ектаў характэрнымі для яго атрыбутамі. Апісанне персаналіі (варыянты імя на беларускай, рускай мовах і лацінскай графіцы, псеўданімы, крыптанімы і іншыя адметнасці; даты жыцця, месца нараджэння, роду дзейнасці, ўзнагароды і званні, геаграфічныя аб'екты, з якімі звязана асоба і інш.). Асаблівасці апісанняў гістарычных падзей, дат, арганізацый, устаноў і інш.

Аднаўзроўневыя фактаграфічныя запісы, асаблівасці двухузроўневых і шматузроўневых фактаграфічных запісаў. Кароткая даведка, пашыраная даведка і даведачны артыкул як увасабленне фактаграфічнага запісу, іх функцыянальныя і стылістычныя адрозненні. Камплексіраванне з іншымі відамі сацыяльнай інфармацыі (макрааб'ектамі); значэнне камлексіравання з бібліяграфічнай інфармацыяй.

Агульная характарыстыка тыпаў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі, ствараемай у бібліятэках; яе адрозненні ад фактаграфічнай прадукцыі камерцыйных вытворцаў.

**Тэма 3. Методыка падрыхтоўкі храналагічных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі**

Хронікі, календары і летапісы як асноўныя жанры фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі бібліятэк.

Фактаграфічныя БД і картатэкі тыпу "Хроніка края/населенага пункта", іх метадычныя асаблівасці і значэнне для падрыхтоўкі іншых хранікальных жанраў фактаграфічнай прадукцыі. Асаблівасці хронік культурнага жыцця абласцей.

Прызначэнне календароў, ствараемых бібліятэкамі і іх разнавіднасці. Асноўныя крыніцы выяўлення дат і адлюстроўваемых у сувязі з імі аб'ектаў: персон, падзей, населеных пунктаў, устаноў і арганізацый і інш. Крытэрыі адбора дат. Вывучэнне выяўленага матэрыялу, стварэнне фактаграфічнага запісу згодна вызначанай структуры (мадэлі). Прадстаўленне падрыхтаванага матэрыялу ў друкаванай і электроннай формах.

Прызначэнне і метадычныя асаблівасці іншых фактаграфічных рэсурсаў, заснаваных на храналагічным прынцыпе арганізацыі матэрыялу: падрыхтоўка апісанняў каляндарных падзей рэгіёна (населенага пункта) для раздзела навін на сайтах бібліятэк; летапісаў краю (населенага пункта) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Методыка падрыхтоўкі персанаграфічных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі

Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў як універсальны фактаграфічны рэсурс. Структура запісу на імёны аўтараў і персаналій, радавыя імёны нацыянальных энтытэтаў. Выкарыстанне нацыянальных энтытэтаў ў бібліятэках. Асаблівасці фактаграфічных запісаў у базе даных "Вучоныя Беларусі" і іншых буйнейшых электронных рэсурсаў бібліятэк Беларусі.

Асаблівасці персанаграфічных даведнікаў краязнаўчых, галіновых, калектываў устаноў і арганізацый і інш. Фактаграфічная інфармацыя ў біябібліяграфічных слоўніках.

Літаратурныя карты рэгіёнаў/населеных пунктаў. Прэваліраванне фактаграфічнай інфармацыі, інтэграванне з бібліяграфічнай і паўнатэкставай інфармацыяй. Структура (асноўныя раздзелы), навігацыя, пошукавыя інструменты, мульцімедыйнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Лабараторныя заняткі | |
| *1* | *2* | *3* | 4 | 5 |
| 1 | Уводзіны | 0,5 | | |
| 2 | Тэарэтыка-метадычныя пытанні стварэння фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў | 2 | - | Апытанне. |
| 2 | Асаблівасці фактаграфічнага запісу ў розных жанрах інфармацыйнай прадукцыі | 1,5 | - | Апытанне. |
| 3 | Методыка стварэння хранікальных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі | 2 | 2<br>- | Праверка і абмеркаванне матэрыялаў, падрыхтаваных у межсесійны перыяд.<br>Апытанне. |
| 4 | Методыка стварэння персанаграфічных жанраў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі | 2 | 2 | Праверка і абмеркаванне матэрыялаў, падрыхтаваных у межсесійны перыяд.<br>Апытанне. |
| | **Усяго** | **8** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. Астафьева, Л. В. Фактографические базы данных в системе краеведческих информационных ресурсов / Л. В. Астафьева [Электронный ресурс] // Краеведение: потенциал развития в XXI веке : материалы международной научно-практической конференции, посвященной 125-летию Алтайской краевой универсальной научной библиотеки (Барнаул, 14–18 октября 2013 г.) – Режим доступа: http://akunb.altlib.ru/files/pdf/006.pdf.

2. Биобиблиографические указатели и базы данных // Справочник библиографа. – 4- е изд, испр. и доп. – СПб., 2014. – С.565-575.

1. Бушило, Л. БД "Ученые Беларуси” как инновационный корпоративный ресурс библиотек Беларуси / Л. Бушило, Т. Кузьминич // Бібліятэчны свет. — 2013. — № 4. — С. 9—11.

2. Ганчарова, А.В. Использование электронной коллекции “Витебщина: документальное наследие” в поиске малоизвестных исторических фактов, выявлении и возвращении незаслуженно забытых имен истории края / Ганчарова А.В. Книжное наследие А.П. Сапунова : материалы республиканской научно-практической конференции (Витебск, 23 декабря 2013 г.). – Минск, 2014. – С. 181-187.

3. Ильина, С.В. Технология использования авторитетных баз данных в создании фактографических баз данных по краеведению / Ильина С.В. // Бібліятэчны веснік : [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [рэдкалегія: Р. С. Матульскі (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2010. — Вып. 2. — С. 167—174.

4. Кузьмініч, Т.В. Бібліятэчны сегмент нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў: тэарэтыка-метадычны аналіз / Т.В. Кузьмініч // Бібліятэчны веснік : зборнік артыкулаў. Вып. 1. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2010. – С.45 – 60.

5. Кузьминич, Т. В. Фактографические базы данных Национальной библиотеки Беларуси: новый этап развития / Т. В. Кузьминич // Развитие информатизации и государственной системы научно-технической информации : РИНТИ–2009 : VIII Международной конференции, 16 ноября 2009 г. – Минск, 2009. – С. 200–204.

6. Новостные ленты // Справочник библиографа. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С. 598-601.

7. Особенности составления и подачи информационных материалов на сайт библиотеки: методические рекомендации в рамках Школы повышения компьютерной грамотности / ГУК «Централизованная библиотечная сеть Быховского района», Отдел библиотечной рекламы и маркетинга :


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[составитель И. А. Маргунова; редактор Т. Т. Коржова ; ответственный за выпуск Н. А. Корзо]. – Быхов : Центральная районная библиотека им. Б. В. Стрельцова, 2017. – 17с. : ил.

8. Пупчина, Н.В. Создание фактографической базы данных по краеведению и использование ее в формировании гражданского и патриотического самосознания у детей / Н.В. Пупчина // http://rudocs.exdat.com/docs/index-258274.html?page=2.

9. Путеводитель по краеведческим ресурсам на библиотечных сайтах в Интернет [Электронный ресурс] // Российская национальная библиотека http://www.nlr.ru/res/inv/kray/list2.htm.

10. Фактаграфічныя базы даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як крыніца інфармацыі пра нацыянальныя аб’екты // Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў / Нацыянальная бібліяграфія Беларусі ; [аўтары-складальнікі: І.У. Градоўкіна і інш.] ; пад навуковай рэдакцыяй Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. – С. 22-35.

## 5.4 ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Ахремчик, Р. В. Электронные персональные указатели серии "История НАН Беларуси в лицах": от библиографических списков к полным текстам / Р.В. Ахремчик, Т.В. Пинчук [Электронный ресурс] – URL: library.basnet.by/simple-search?filterquery=Ахремчик%2C+Регина+Вацлавовна&filtername=author&filtertype=equals.

2. Бушило, Л.Л. Географические названия как объект отражения в национальной БД авторитетных записей / Бушило Л. Л., Сокол Т. Ф. // Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: праблемы фарміравання і выкарыстання: зборнік артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; [складальнік Т. В. Кузьмініч; рэдкалегія: Л. Г. Кірухіна і інш.] — Мінск, 2008. – С. 151—165.

2. Ильина, С.В. Национальные особенности корпоративной базы данных авторитетных/нормативных записей библиотек Беларуси / С.В. Ильина, Л.Л. Бушило [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.twirpx.com/file/1252982/.

1. Карауш, А.С. Опыт использования фактографической базы данных «Календарь знаменательных дат» в Томской МИБС / А.С. Карауш, Г.В.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павлюченко [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2016/disk/051.pdf.

2. Коновалова, Н. Работа Гомельской областной универсальной библиотеки имени В. И. Ленина по изучению и сохранению историко-культурного наследия региона / Н.Коновалова, Н. Серикова // Бібліятэчны свет . — 2011. — № 2. — С. 30—31.

3. Коптик, С.К Информационные краеведческие ресурсы: доступ и обслуживание пользователей // С.К. Коптик // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2013. – С. 242-250.

4. Мешачак, Н.А. Веб-календарь знаменательных дат как средство продвижения библиотечных ресурсов / Н. А. Мешачак, А.С. Карауш [Электронный ресурс]. – Режим доступа : // http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2016/disk/052.pdf/

5. Пронина, Л.А. Электронные коллекции краеведческих информационных ресурсов: библиоэкологические аспекты / Л.А. Пронина, Н.Е. Копытова, Н.В. Шаталова, А.Н. Евстигнеев, В.В. Дубенский // Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий : сборник статей. / Рос. Гос. б-ка ; НИО библиографии. – Москва : Пашков дом, 2007. – С. 76–83.

6. Сухорукова, Р.Н. РНТБ в системе научно-технической информации страны / Р. Н. Сухорукова, В. А. Шишкин // Информационный бюллетень РНТБ / Республиканская научно-техническая библиотека. – 2016. –и № 1. — С. 3-7.

7. Хромова, Е.Г. Электронные краеведческие ресурсы – как основа региональной, локальной и социальной памяти: опыт создания краеведческого информационного продукта «Персона в Белово» / Е.Г. Хромова, О.П. Душенкова // Новая библиотека. – 2009. – № 2. – С. 46–48.

10. Шахнович, Г. Краязнаўчая электронная база даных “Горад дзевяці стагоддзяў”: фарміраванне, папаўненне, выкарыстанне / Г.Шахновіч // Бібліятэчны свет. – 2012. – № 5. – С.17 – 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.5 Электронныя адукацыйныя рэсурсы

У мэтах паляпшэння нагляднасці лекцыйнага матэрыялу выкарыстоўваюцца электронныя прэзентацыі ў праграме Power Point па тэмах:

1. Тэарэтычныя стварэння фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў.
2. Асаблівасці фактаграфічнага запісу ў розных жанрах інфармацыйнай прадукцыі.
3. База даных "Вучоныя Беларусі" / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. URL: http://www.nlb.by/content/informatsionnye-resursy/elektronnye-informatsionnye-resursy/svodnye-resursy-bibliotek-belarusi/uchenye-belarusi.
4. База даных "Бібліятэкі Беларусі і замежных краін" / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. URL: http://interlib.nlb.by/bb/index/index.php.
5. База данных «Белорусские имена в мировой науке и технике» / Республиканская научно-техническая библиотека. URL: http://rntbcat.org.by/belnames.
6. База данных "История белорусской науки в лицах" / Центальная научная библиотека им. Я. Коласа НАН Беларуси. URL: http://csl.bas-net.by/web/pages/science-history/science-history.asp.
7. База даных "Таленты ад роднай зямлі" / Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна. URL: http://catalog.library.mogilev.by/writers/index.php.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ